„НЯ ЗЬНІЖАЦЬ ТЭМПЫ,
А ПА МЕРЫ СІЛ І МАГЧЫМАСЬЦЯЙ ІХ ПАВЯЛІЧВАЦЬ.

Пралетары усіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДАНЬНЯ—XV
№ 35 (3939)
ПЯТНІЦА, 6 ЛЮТАГА
1931 г.
Цана нумару 5 коп.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

ЗАТРЫМАЦЬ ТЭМПЫ—ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ АДСТАЦЬ, А АДСТАЛЫХ Б'ЮЦЬ"

З прамовы тав. СТАЛІНА на Ўсесаюзнай канфэрэнцыі работнікаў прамысловасьці

Таварышы! Работы вашай канфэрэнцыі набліжаюцца да канца. Зараз вы будзеце прымаць рэзалюцыі. Не сумняваюся, што яны будуць прыняты аднагалосна. У гэтых рэзалюцыях, я іх крыху ведаю, вы ўхваляеце кантрольныя лічбы прамысловасьці на 1931 год і даеце абавязацельства выконваць іх. Слова бальшавіка—сур'ёзнае слова. Бальшавікі прывыкалі выконваць абяцаньні, якія яны даюць.

Але, што значыць—абавязацельства выканаць кантрольныя лічбы на 1931 год? Гэта значыць—забясьпечыць агульны прырост прамысловай прадукцыі **на 45 проц.** А гэта вельмі вялікая задача. Мала таго, такое абавязацельства значыць, што вы ня толькі даеце абяцаньне нашу пяцігодку выканаць за чатыры гады, гэта справа ўжо вырашана і ніякіх рэзалюцый тут больш ня трэба,—гэта значыць, што **вы абяцаеце выканаць яе за тры гады па асноўных, рашаючых галінах прамысловасьці.**

Гэта добра, што канфэрэнцыя дае абяцаньне выканаць план па 1931 год, выканаць пяцігодку за тры гады. Але мы навучаны «горкім вопытам», мы ведаем, што незаўсёды абяцаньні выконваюцца. У пачатку 1930 году таксама было дана такое абяцаньне выканаць гадавы план. Гады трэба было павялічыць прадукцыю нашай прамысловасьці на 31-32 проц. Адных абяцаньне ня было выканана. Прырост прамысловай прадукцыі на справе склаў на 1930 год 25 проц. Мы павінны задаць пытаньне: а ці не паўтарыцца тое-ж самае і ў гэтым годзе? Кіраўнікі, работнікі нашай прамысловасьці даюць вораз абяцаньне павялічыць прадукцыю прамысловасьці ў 1931 годзе на 45 проц. Але якая гарантыя, што абяцаньне будзе выканана? Што патрабуецца для таго, каб выканаць кантрольныя лічбы, каб даць прырост прадукцыі ў 45 проц., каб дабіцца выканаўня пяцігодкі не за чатыры, а па асноўных і рашаючых галінах за тры гады?

Для гэтага патрабуецца дзве асноўныя ўмовы. Па-першае,—каб былі рэальныя, ці, як у нас выражаюцца, аб'ектыўныя магчымасьці для гэтага. Па-другое,—каб было жаданьне і ўменьне кіраваць нашымі прадпрыемствамі такім чынам, каб гэтыя магчымасьці былі ператвораны ў жыцьцё.

Ці былі ў нас у мінулым годзе аб'ектыўныя магчымасьці для поўнага выкананьня пляну? Так, былі. Бясспрэчныя факты сьведчаць аб гэтым. Гэтыя факты заключаюцца ў тым, што ў сапраўдным і красавіку мінулага году прамысловасьць дала прырост прадукцыі ў 31 проц., параўнальна з папярэднім годам. Чаму-ж, пытаюся, мы ня выканалі пляну за ўвесь год? Што перашкодзіла? Чаго не хапіла? Не хапіла ўменьня спаборнічаць, ня хапіла ўменьня кіраваць нашымі заводамі, фабрыкамі, капальнямі. Мы мелі першую ўмову: аб'ектыўныя магчымасьці для выкананьня пляну. Але мы ня мелі ў патрэбнай ступені другой умовы: **уменьня кіраваць вытварчасьцю.** І іменна таму, што ўменьня кіраваць прадпрыемствамі не хапіла, іменна таму плян аказаўся невыкананым. Замест 31-32 проц. прыросту мы далі толькі 25 проц. Вядома, 25 проц. прыросту—вялікая справа. Ні адна капіталістычная краіна ня мела ў 1930 годзе і ня мае зараз прыросту прадукцыі. Ва ўсіх іншых выкліканыя капіталістычных краінах мае месца рэзкае зьніжэньне вытворчасьці. У такіх умовах 25 проц. прыросту—вялікі крок наперад. Але мы маглі даць больш. Мы мелі для гэтага ўсе неабходныя «аб'ектыўныя» ўмовы.

Якая-ж гарантыя, што ў гэтым годзе не паўтарыцца казус мінулага году, што плян будзе выканан поўнасьцю, што наяўныя магчымасьці намі будуць выкарыстаны так, як трэба, што ваша абяцаньне не застанецца ў паўнай часьці на паперы? У гісторыі дзяржаў, у гісторыі краін, у гісторыі армій бывалі выпадкі, калі меліся ўсе магчымасьці для посьпеху, для перамогі, але яны, гэтыя магчымасьці, заставаліся бяз вынікаў, бо кіраўнікі не заўважалі гэтых магчымасьцяй, ня ўмелі выкарыстаць іх, і армії цярпелі паражэньне.

Ці ёсьць у нас усе магчымасьці, неабходныя для выкананьня кантрольных лічбаў на 1931 год? Так, такія магчымасьці ў нас ёсьць. У чым заключаюцца гэтыя магчымасьці, што патрабуецца для таго, каб гэтыя магчымасьці істалі ў рэальнасьці? Перш за ўсё патрабуецца выстарчальная прыродная багацьці: жалезная руда, вугаль, хлеб, бавоўна. Ці ёсьць яны ў нас? Ёсьць. Ёсьць больш, чым у любой іншай краіне. Узяць хаця-б **Урал**, які прадстаўляе такую камбінацыю багацьцяў, якой нельга знайсьці ні ў адной краіне. У нас ёсьць усё, апрача хіба каўчуку. Але праз год-два і каўчук мы будзем мець у сваім распараджэньні. З другога боку, з боку прыродных багацьцяў, мы забясьпечаны поўнасьцю. Іх у нас нават больш, чым трэба.

Што яшчэ патрабуецца? Патрабуецца наяўнасьць такой улады, якая мела-б жаданьне і сілу рушыць скарыстаньне гэтых вялізарных багацьцяў на карысьць народу. Ці ёсьць у нас такая ўлада?—Ёсьць. Праўда, наша работа па скарыстаньні прыродных багацьцяў не заўсёды абыходзіцца без спрачак паміж нашымі-ж работнікамі. Напрыклад, у мінулым годзе савецкай уладзе прыйшлося весьці некаторую барацьбу па пытаньні аб стварэньні другой вугальна-металюргічнай базы, без якой мы ня можам больш развівацца. Але мы ўжо перамаглі гэтыя перашкоды. І ў нас будзе ў хуткім часе гэта база.

Што яшчэ патрабуецца?—Яшчэ патрабуецца, каб гэта ўлада карысталася падтрыманьнем мільённых мас рабочых і сялян. Ці карыстаецца наша ўлада такім падтрыманьнем? Так, карыстаецца. Ва ўсім сьвеце ня знойдзеце вы такой другой улады, якая-б карысталася такім падтрыманьнем рабочых і сялян, якой карыстаецца савецкая ўлада. Ня буду спасылацца на факты росту сацыялістычнага спаборніцтва, на факты росту ўдарніцтва, на кампанію барацьбы за сустрэчны прамфінплян. Усе гэтыя факты, у якіх наглядна відаць падтрыманьне савецкай улады з боку мільённых мас, агульнавядомы.

Што яшчэ трэба, каб выканаць і перавыканаць кантрольныя лічбы на 1931 год? Патрэбна яшчэ наяўнасьць такога ладу, які-б быў свабодзен ад нявылечных хвароб капіталізму і які даваў-бы сур'ёзныя перавагі перад капіталізмам. Крызіс, беспрацоўе, марнатраўнасьць, галеча шырокіх мас—вось нявылечныя хваробы капіталізму. Наш лад ня мае гетых хвароб, таму, што ўлада—у нашых руках, у руках рабочае клясы, таму, што мы вядзем плянавую гаспадарку, плянамерна накапляем рэсурсы і правільна разьмяркоўваем іх па галінах народнае гаспадаркі. **Мы свабодны ад нявылечных хвароб капіталізму. У гэтым наша адзнака, у гэтым наша рашаючая перавага перад капіталізмам.**

Паглядзеце, як капіталісты хочуць выйсьці з крызісу. Яны зьніжаюць максымальна заработную плату рабочых. Яны зьніжаюць максымальна цэны на сырэц і харчовыя прадукты. Але яны ня хочуць зьнижаць колькі-небудзь сур'ёзна цэны на прамысловыя вырабы. Гэта значыць, што **яны хочуць выйсьці з крызісу за кошт асноўных спажыўцоў тавараў, за кошт рабочых, за кошт сялян, за кошт працоўных усіх краін,** якія вырабляюць сырэц і харчы. Капіталісты падрываюць той шлях, па якім яны ідуць. І замест выхаду з крызісу атрымліваецца яго паглыбленьне, атрымліваецца накапленьне новых прадасылак, якія вядуць да новага, яшчэ больш жорсткага крызісу.

Наша перавага заключаецца ў тым, **што мы ня ведаем крызісаў перавытворства, мы ня маем і ня будзем мець мільёнаў беспрацоўных, мы ня маем анархіі ў вытворстве, бо мы вядзем плянавую гаспадарку.** Але гэта ня ўсё. Мы—**краіна самай сканцэнтраванай прамысловасьці.** Гэта значыць, што мы можам будаваць нашу прамысловасьць на асноне самай лепшай тэхнікі і забясьпечваць дзякуючы гэтаму нябачную прадукцыйнасьць працы, нябачны тэмп накапленьня. Наша слабасьць у мінулым была ў тым, што гэта прамысловасьць безавалася на распыленай сялянскай гаспадарцы. Але гэта было, цяпер гэтага ўжо няма. **Заўтра, можа быць праз год, мы станем краінай самай буйной у сьвеце сельскай гаспадаркі.** Саўгасы і калгасы,—а яны зьяўляюцца формамі прапоўнай гаспадаркі—ужо ў гэтым годзе далі палову ўсяго нашага таварнага збожжа. А гэта значыць, што **наш лад, савецкі лад** дае нам такія магчымасьці шпаркага прасоўваньня наперад, аб якіх ня можа марыць ні адна буржуазная краіна.

Што яшчэ патрабуецца для таго, каб пасоўвацца наперад сямімільнымі крокамі? Патрабуецца наяўнасьць партыі, даволі згуртаванай і адзінай для таго, каб накіраваць намаганьні ўсіх лепшых людзей рабочае клясы ў адзін пункт, і даволі вопытнай для таго, каб ня адмёйфіць перад труднасьцямі і сыстэматычна праводзіць у жыцьцё правільную, рэвалюцыйную, бальшавіцкую палітыку.

Ці ёсьць у нас такая партыя? Так, ёсьць. Ці правільна яе палітыка? Так, правільна, бо яна дае сур'ёзныя посьпехі. Гэта прызнаюць цяпер ня толькі прыяцелі, але і ворагі рабочае клясы. Паглядзеце, як выюць і шалеюць супроць нашай партыі ўсім вядомыя «паважаныя» джэнтльмэны: **Фіш** у Амэрыцы, **Чэрчыль** у Англіі, **Пуанкарэ** ў Францыі. Чаму яны выюць і шалеюць? Таму, што палітыка нашай партыі правільна, таму, што яна дае посьпехі за посьпехамі. Вось, таварышы, усе тыя матэрыялы, якія абягчаюць нам ажыцьцяўленьне кантрольных лічбаў 1931 году, якія даюць магчымасьць выканаць пяцігодку за чатыры, а ў рашаючых галінах нават за тры гады. Такім чынам, першая ўмова для выкананьня пляну—«аб'ектыўныя» магчымасьці ў нас ёсьць.

Ці ёсьць у нас другая ўмова—уменьне скарыстаць гэтыя магчымасьці? Інакш кажучы, ці ёсьць у нас правільнае кіраўніцтва фабрыкамі, заводамі, капальнямі? Ці ўсё тут стаіць добра?—На жаль, тут ня ўсё добра. І мы, як бальшавікі, павінны гэта сказаць проста і адкрыта. Што значыць кіраваць вытворствам? У нас не заўсёды глядзяць па-бальшавіцку на пытаньне аб кіраўніцтве прадпрыемствамі. У нас нярэдка думаюць, што кіраваць—гэта значыць падпісваць паперы. Гэта сумна, але гэта факт. Часамі мімаволі ўспамінаеш памадураў Шчадрына. Успомніце, як памадурка навучала маладога памадура: «Не ламай галаву над навукай, не пазбыбляйся ў справу, нахай іншыя займаюцца гэтым, не твая гэта справа,—твая справа кіраваць, падпісваць паперы». Трэба прызнаць, на наш сорам, што і сярод нас, сярод бальшавікоў, ёсьць нямала такіх, якія кіруюць шляхам падпісваньня папер. А вось, каб пазбыбляцца ў справу, аўладаць тэхнікай, стаць гаспадаром справы,—пакуль гэтага ні-ні. Як мала здарыцца, што мы, бальшавікі, зрабіўшы тры рэвалюцыі, выйграўшы з перамогай з жорсткай грамадзянскай вайны, вырашыўшы цяжкую задачу стварэньня прамысловасьці, павярнуўшы сялянства на шлях сацыялізму, як мала здарыцца, што ў справе кіраўніцтва вытворствам пасуем перад напёркай? Прычына тут заключаецца ў тым, што падпісваць паперы дагчай, чым кіраваць вытворствам. І вось, многія гаспадарнікі пашлі па гэтай лініі найменшага супраціўленьня. Ёсьць тут і наша віна, віна цэнтру. Год дзесяць таму назад быў дан лёзунг: «З тае прычыны, што камуністы тэхнікі вытворства яшчэ як трэба не разумеюць, бо ім цяжка яшчэ вучыцца кіраваць гаспадаркай, дык няхай тэхнікі і іншы-спэцыялісты вядуць вытворства, а вы, камуністы, ня ўмешвайцеся ў тэхніку справы, але, ня ўмешваючыся, вывучайце тэхніку, вывучайце навуку кіраўніцтва вытворствам, не пакладаючы рук, каб потым стаць разам з адданымі нам спэцыялістамі сапраўднымі кіраўнікамі вытворства, сапраўднымі гаспадарамі справы». Такавы быў лёзунг.

А што вышла на справе? Другую частку гэтай формулы адкінулі, бо вучыцца цяжка, а першую частку формулы апагапілі, тлумачачы неўмяннальнасьць як адмаўленьне ад вывучэньня тэхнікі вытворства. Атрымалася бязглузьдзіца, шкодная і небясьпечная бязглузьдзіца, ад якой, чым скарэй вызваліся, тым лепш. Само жыцьцё ня раз сыгналізавала нам аб шкодным становішчы, само жыцьцё паказала, што ў партарганізацыі і прафсаюзаў не хапіла рэвалюцыйнай пільнасьці. Яно паказала, што нашы гаспадарнікі злачынна адсталі ў тэхнічных адносінах, што інжынэры і тэхнікі, працуючы бес кантрольна, лягчай скочваюцца на шлях шкодніцтва, тым больш, што ім бесьперапынна пасылаюць «прапановы» ворагі з-за граніцы.

Другі сыгнал—працэс «прампартыі». Вядома, у аснове шкодніцтва ляжыць клясавая барацьба. Вядома, клясавы вораг шалёна супраціўляецца сацыялістычнаму наступленьню. Але аднаго гэтага для вытлумачэньня такога шыпнага рэскіту шкодніцтва мала. Як мала здарыцца, што шкодніцтва набыло такія шырокія разьмеры?

Хто вінават у гэтым? Мы ў гэтым вінаваты. Калі-б мы справу кіраўніцтва гаспадаркай паставілі інакш, калі-б мы значна раней перайшлі да вывучэньня тэхнікі справы і аўладаньня тэхнікай, калі-б мы часьцей і больш талкова ўмешваліся-б у кіраўніцтва гаспадаркай, шкоднікам не ўдалося-б так многа нашкодзіць. Трэба самім стаць спэцыялістамі, гаспадарамі справы, трэба навучыцца тварам да тэхнікі, тварам да тэхнічных недаў,—вось куды штурхала нас жыцьцё.

Але ні першы сыгнал, ні нават другі сыгнал не забясьпечыў яшчэ неабходнага павароту. **Час, даўно час павярнуцца тварам да тэхнікі.** Час адкінуць стары лёзунт, адкінуць лёзунк аб неўмяшальнасьці ў тэхніку, і стаць самім спэцыялістамі, знаўцамі справы, стаць самім поўнымі гаспадарамі справы.

Пытаюцца часта, чаму ў нас няма адзінаначальня? Яго няма і ня будзе пакуль мы не аўладаем тэхнікай. Пакуль сярод нас, сярод бальшавікоў, ня будзе выстарчальнай колькасьці людзей, добра знаёмых з пытаньнямі тэхнікі, эканомікі і фінансаў, у нас ня будзе сапраўднага адзінаначальня. Пішэце колькі хочаце рэзалюцый, клянёцеся якімі хочаце словамі, але, калі не аўладаеце тэхнікай, эканомікай, фінансамі заводу, фабрыкі, капальні—толку ня будзе. Задача, значыцца, заключаецца ў тым, каб нам самім аўладаць тэхнікай, самім стаць гаспадарамі справы. Толькі ў гэтым гарантыя таго, што нашы планы будуць поўнасьцю выкананы, а адзінаначальне будзе праведзена. Справа гэта, вядома, ня лёгкая, але не цалкам можна перамагчы. Навука, тэхнічны вопыт, веды,—усё гэта справа нажыўная. Сёньня няма, а заўтра будзе. Галоўнае заключаецца ў тым, каб мець гарачае бальшавіцкае жаданьне аўладаць тэхнікай, аўладаць навукай вытворства. Пры гарачым жаданьні можна дабіцца ўсяго. Можна перамагчы ўсё.

Часамі пытаюцца: ці нельга крыху зьнізіць тэмпы, прытрымаць рух? Не, нельга, таварышы. Нельга зьнижаць тэмпы. Наадварот, па меры сіл і магчымасьцяй нам іх трэба павялічваць. Гэтага патрабуюць ад нас нашы абавязацельствы перад рабочымі і сялянамі ў СССР. Гэтага патрабуюць ад нас нашы абавязацельствы перад рабочай клясай усяго сьвету. **Затрымаць тэмпы, гэта значыць адстаць. А адсталых б'юць.** Але мы ня хочам быць бітымі! Не, ня хочам. Гісторыя старой Расіі заключаецца ў тым, што яе бесьперапынна білі за адсталасьць. Білі манголскія ханы, білі турэцкія бэі, білі шляхецкія фэадалы, білі польска-літоўскія паны, білі францускія капіталісты, білі японскія бароны. Білі за адсталасьць. За адсталасьць ваенную, за адсталасьць культурную, за адсталасьць дзяржаўную, за адсталасьць прамысловую, за адсталасьць сельска-гаспадарчую. Білі таму, што гэта было даходна і сходзіла безпакарана.

Памятаеце словы даревалюцыйнага паэта: «ты и убогая, ты и обильная, ты и могучая, ты и бессильная, матушка Русь». Гэтыя словы старога паэта добра запомнілі гэтыя панове. Яны білі і прыгаварвалі: «ты обильная»—значыцца можна пажывіцца. Яны білі і прыгаварвалі: «ты убогая и бессильная»—значыцца, можна біць і рабаваць безпакарання. Такі быў закон капіталізму — біць адсталых і слабых. Гэта закон капіталізму: ты адстаў, ты слабы, — значыцца ты ня маеш рацыі, значыцца, табе можна біць і прыгнятаваць. Ты магутны — значыцца, ты маеш рацыю, значыцца, табе трэба асьцерагацца. Вось чаму нельга нам больш адставаць.

У мінулым у нас ня было і не магло быць бацькаўшчыны. Але цяпер, калі ўлада ў нас рабочая, у нас ёсьць бацькаўшчына, і мы будзем адстойваць яе незалежнасьць. Ці хочаце, каб наша сацыялістычная бацькаўшчына была біта і каб страціла сваю незалежнасьць?

— Калі гэтага ня хочаце, дык трэба ў найкарацейшы тэрмін ліквідаваць яе адсталасьць і развіць сапраўдныя бальшавіцкія тэмпы ў справе разьвіцьця яе гаспадаркі. Іншых шляхоў нама. Вось чаму Ленін гаварыў у часе Кастрычніка: «або сьмерць, або дагнаць і перагнаць перадавыя капіталістычныя краіны». Мы адсталі ад перадавых краін на 50-100 год. Мы павінны прабегчы гэту адлегласьць за 10 год. Або мы зробім гэта, або нас затруць. Вось што дыктуе нам наша абавязацельства перад рабочымі і сялянамі СССР.

Але ў нас ёсьць яшчэ іншыя, больш сур'ёзныя і больш важныя абавязацельствы. Гэта — абавязацельствы перад сусьветным пралетарыятам. Яны супадаюць з абавязацельствамі першага роду. Але мы іх ставім вышэй. Рабочая кляса СССР ёсьць частка сусьветнай рабочай клясы. Мы перамаглі ня толькі намаганьнямі рабочае клясы СССР, але і **дзякуючы падтрыманьню сусьветнае рабочае клясы.** Без такога падтрыманьня нас даўно расклявалі-б. Гаворыць, што наша краіна зьяўляецца ўдарнай брыгадай пралетарыяту ўсіх краёў. Гэта добра сказана.

Дзеля чаго падтрымлівае нас міжнародны пралетарыят? Чым мы заслужылі такое падтрыманьне? Тым, што мы першыя кінуліся ў бой з капіталізмам, што мы першыя ўстанавілі рабочую ўладу, мы першыя сталі будаваць сацыялізм. Тым, што мы робім справу, якая, у выпадку посьпеху, перавярне ўвесь сьвет і вызваліць усю рабочую клясу.

А што трэба для посьпеху? Ліквідацыя нашай адсталасьці, разьвіцьцё высокіх, бальшавіцкіх тэмпаў будаўніцтва. Мы павінны рухацца наперад так, каб рабочая кляса ўсяго сьвету, гледачы на нас, магла сказаць: **«вось ён, мой пераходны атрад, вось яна, мая ўдарная брыгада, вось яна, мая рабочая ўлада, вось яна, мая бацькаўшчына, — яны зрабілі сваю справу, нашу справу — добра, падтрымаем іх супроць капіталістаў і распалім справу сусьветнай рэвалюцыі».**

Ці павінны мы апраўдаць надзеі сусьветнае рабочае клясы? — Так, павінны, калі мы ня хочам зганьбіцца. Такавы нашы абавязацельствы. Вы бачыце, што яны патрабуюць ад нас узмацненьня бальшавіцкіх тэмпаў разьвіцьця.

Не скажу, што ў адносінах кіраўніцтва гаспадаркай у нас за гэтыя гады нічога ня зроблена. Зроблена і нават вельмі шмат. Мы ўдвая павялічылі прадукцыю прамысловасьці параўнальна з даваеннай, мы стварылі самае буйное ў сьвеце сельска-гаспадарчае вытворства. Але маглі-б зрабіць яшчэ больш, калі-б пастараліся за гэты час па сапраўднаму аўладаць вытворствам, яго тэхнікай, яго фінансава-эканамічным бокам. Максымум у 10 год мы павінны прабегчы тую адлегласьць, на якую мы адсталі ад перадавых краін капіталізму. Для гэтага ёсьць у нас усе «аб'ектыўныя» магчымасьці. Не хапае толькі ўменьня скарыстаць па-сапраўднаму гэтыя магчымасьці, а гэта залежыць ад нас. Толькі ад нас.

Пара нам павучыцца скарыстаць гэтыя магчымасьці. Пара пакончыць з гнілой установкай неўмяшальніцтва ў вытворства, пара засвоіць іншую, новую, адпаведную цяперашняму перыяду ўстаноўку: умешвацца ва ўсё. Калі ты дырэктар заводу, умешвайся ва ўсе справы, сачы за ўсім, не абмінай нічога, вучыся і яшчэ раз вучыся. Бальшавікі павінны аўладаць тэхнікай. Пара бальшавікам самім стаць спэцыялістамі. Тэхніка ў перыяд рэконструкцыі раней ўсё і гаспадарнік, які не жадае аўладаць тэхніку, які не жадае аўладаць тэхнікай, гэта анэкдот, а не гаспадарнік.

Гаворыць, што цяжка аўладаць тэхнікай. Няправільна. Нема такіх вышынь, якіх бальшавікі не маглі-б узяць. Мы выраслі рад труднейшых задач. Мы ўзялі ўладу. Мы павярнулі серадняка на шлях сацыялізму. Самае важнае з пункту гледжаньня будаўніцтва мы ўжо зрабілі. Нам засталося нямнога. Вывучыўшы тэхніку — аўладаць навукай. Калі мы зробім гэта, тады ў нас пойдуць такія тэмпы, аб якіх зараз мы не адважваемся і марыць. І мы гэта зробім, калі захочам гэтага па-сапраўднаму. (Канфэрэнцыя стоячы суправаджае тав. Сталіна бурнай, працяжнай авацыяй. Выгукі «ура», «няхай жыве правадыр партыі — тав. Сталін»).

Прамфінплян першага кварталу— выканаць поўнасьцю!

Грандыёзная праграма работ трэцяга году пяцігодкі, якая павінна завяршыць пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі Савецкага Саюзу, патрабуе самай дакладнай, штодзённай ПРАВЕРКІ ВЫКАНАНЬНЯ заданьняў па ўсіх вучастках нашага будаўніцтва.

Тэмпы разьвіцьця, вызначаныя народна-гаспадарчым плянам, вельмі напружаныя і прад'яўляюць жорсткія патрабаваньні поўнага выкарыстоўваньня ўсіх эканамічных рэсурсаў краіны, мабілізацыі ўсіх сіл і энэргіі партыі, рабочай клясы, усіх працоўных.

Асабліва вялікія і адказныя задачы, што стаяць у гэтым годзе перад нашай прамысловасьцю, якая зьяўляецца вядучым пачаткам у справе ўсёй сацыялістычнай рэконструкцыі народнае гаспадаркі. Наколькі напружаны заданьні прамысловасьці відаць хаця-б з таго, што па БССР рост валавой прадукцыі вызначан у разьмерах 74 проц., па лініі ВСНГ (без харчовай прам. і Лесбелу) і 100 проц. па лініі Наркамату забесьпячэньня. Зьніжэньне сабекошту вызначана для рэспубліканскай прамысловасьці ў разьмеры 8 проц. і па НК забесьпячэньня — 7,4 проц., пры абавязковых умовах паляпшэньня якасьці прадукцыі.

Зусім відавочна, што ажыцьцяўленьне гэтых задач магчыма толькі на аснове штодзённай барацьбы за генэральную лінію партыі, за ажыцьцяўленьне вызначаных баявых тэмпаў работы, пры ўмовах бязьлітаснага выкрыцьця ўсіх апартуністычных тэндэнцый.

Мінуў першы месяц першага кварталу бягучага гаспадарчага году. Ужо час падвесьці вынікі за гэты пэрыяд, улічыць памылкі, недахопы, каб працягваць далейшае рашучае наступленьне.

Папярэднія весткі за студзень месяц гавораць аб тым, што ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ БССР СКОНЧЫЛА ГЭТЫ ПЭРЫЯД З ЯЎНА НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫМ БАЛЯНСАМ. Студзеньскія плянавыя заданьні ня выкананы БОЛЬШАСЬЦЮ галін прамысловасьці.

Ня гледзячы на сумны ўрок першага месяца ўдарнага кварталу, многія партыйныя, прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі ўзноў ня здолелі ня толькі дабіцца патрэбнага ЎЗДЫМУ тэмпаў работы, але нават УТРЫМАЦЦА на тым узроўні, які быў дасягнут у канцы ўдарнага кварталу.

Праўда, паасобныя галіны прамысловасьці адчувалі затрудненьні з сырцом і апаламі, ускладненьні былі і па лініі транспарту, але гэта ня можа апраўдваць прарыву, што стварыўся ў выкананьні прамфінпляну. Стаць на пункт погляду «аб'ектыўных» прычын і «апраўданьняў» — значыць скаціцца ў балота апартунізму.

Сьмелы размах нашага будаўніцтва каўхільна суправаджаецца труднасьцямі росту. Толькі апартуністычныя ідэолёгі могуць гаварыць аб «плаўным» руху да сацыялізму. Бальшавіцкае наступленьне выходзіць не з капітуляцыі перад труднасьцямі, але з рашучай перамогі іх, прычым, «нашы труднасьці зьяўляюцца такімі труднасьцямі, якія самі маюць у сабе магчымасьць іх перамаганьня, г. зн., што адзначальная рыса нашых труднасьцяй заключаецца ў тым, што яны самі даюць нам базу для іх перамаганьня». (Сталін).

Часовыя труднасьці на паасобных прадпрыемствах сурова патрабуюць іменна павышэньня нашай пільнасьці, узмацненьня бальшавіцкага націску ў галіне барацьбы з недахопамі, баявой мабілізацыі мас, рашучага паляпшэньня і канкрэтызацыі кіраўніцтва найбольш адстаючымі зьвеньнямі.

Між тым, асноўныя прычыны адставаньня хаваюцца ў недапушчальным ПАСЛАБЛЕНЬНІ ЎВАГІ з боку раду арганізацый да пытаньняў барацьбы за прамфінплян, у імкненьні «АДПАЧЫЦЬ» пасьля напружаных тэмпаў сьнежня, а таксама ў НЕДАХОПАХ КІРАЎНІЦТВА І ПЛЯНАВАНЬНЯ, У НАЯЎНАСЬЦІ АРГАНІЗАЦЫЙНЫХ НЕПАЛАДАК.

На самой справе, ці ўсё магчымае зроблена намі ў галіне ЭКАНОМІІ ВЫДАТКАВАНЬНЯ СЫРЦУ І АПАЛУ — гэтых найбольш слабых вучастках нашай работы?

Трэба з ўсёй катэгарычнасьцю заявіць, што не, ДАЛЁКА НЯ ЎСЁ. У гэтых адносінах ёсьць яшчэ буйнейшыя недахопы. Пытаньні плянавага забесьпячэньня, рацыянальнага выкарыстоўваньня наяўных сырцовых рэсурсаў, максымальнага выкарыстаньня ўсіх магчымасьцяй замены асобных відаў дэфіцытнага сырцу, поўнай манэўранасьці ў гэтых адносінах, пытаньні эканоміі апалу, сапраўдная мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў у шырокім разуменьні гэтага слова — па ўсіх гэтых пытаньнях намі зроблена ВЕЛЬМІ МАЛА, НЕДАПУШЧАЛЬНА МАЛА.

РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКАЯ РАБОТА, рэалізацыя рабочых прапаноў, шырокае скарыстаньне вынаходніцтва таксама яшчэ не дасягнулі патрэбнага ўзроўню. Тут ўсё яшчэ вельмі моцны бюракратызм, тэндэнцыі да кансэрватызму, прасоўваньне наперад чарапашымі крокамі.

БУЙНЫЯ НЕДАХОПЫ ЁСЬЦЬ У ГАЛІНЕ КІРАЎНІЦТВА ПРАМЫСЛОВЫМІ ПРАДПРЫЕМСТВАМІ.

У гэтай сувязі, перш за ўсё, трэба гаварыць аб праблеме адзінаначальня. Выразныя дырэктывы партыі, даныя ў адзначаным кірунку, ажыцьцяўляюцца вельмі слаба. Прынцып злучэньня поўнага адзінаначальня з уменьнем апірацца на заводзкую грамадзкасьць праводзіцца ў жыцьцё далёка ня ўсюды. Слабае правядзеньне адзінаначальня асабліва востра адчуваецца ў ЦЗХАВЫХ зьвеньнях, што цягне за сабой вялізарныя арганізацыйныя непаладкі, незадказнасьць, нераспарадчасьць, прастоі машын.

Сур'ёзныя недахопы маюць месца ў АПЭРАЦЫЙНЫМ КІРАЎНІЦТВЕ ПА ЎСЁЙ СЬСТЭМЕ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ: ЗАВОД—АБ'ЯДНАНЬНЕ—ВСНГ. Зусім відавочна, што асноўнай умовай сапраўднага бальшавіцкага кіраўніцтва зьяўляецца наяўнасьць такой сыстэмы, якая-б забясьпечвала кіруючым органам поўную азнаёмленасьць са справай у тэй ці іншай галіне прамысловасьці і на важнейшых прадпрыемствах. ТОЛЬКІ ПАСТАЯННА ТРЫМАЮЧЫ РУКУ НА ПУЛЬСЕ ЗАВОДЗКАГА АРГАНІЗМУ МОЖНА ХУТКА РЭАГАВАЦЬ І СВАЯЧАСОВА ЎЖЫВАЦЬ ПАТРЭБНЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ. Толькі пры гэтых умовах можна кіраваць, ПАПЯРЭДЖВАЮЧЫ, а не ФІКСУЮЧЫ прарывы. Між тым, сыстэма ўліку інфармацыі зьнізу дзяверху зьдзіўляе сваёй непаваротлівасьцю, наўкладзістасьцю. Трэба проста сказаць, што існуючае становішча рэчаў зусім не гарантуе выкананьня апошніх дырэктыў партыі і ўраду ў галіне паляпшэньня і канкрэтызацыі кіраўніцтва, жорсткай праверкі выкананьня заданьняў.

Ажыцьцяўленьне адказьнейшых праграм трэцяга году магчыма толькі пры самым АКТЫЎНЫМ УДЗЕЛЕ ВА ЎСІХ ГАЛІНАХ НАШАГА БУДАЎНІЦТВА НАЙШЫРЭЙШЫХ МАС РАБОЧАЕ КЛЯСЫ, пры дакладнай і выразнай рабоце ўсіх яе арганізацый. Рост творчай актыўнасьці пралетарыяту, узрастаньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, уздым вытворчай актыўнасьці — вось неадлучныя ўмовы выкананьня прамфінпляну.

Таму пытаньне аб ПАЛЯПШЭНЬНІ ПАРТЫЙНАЙ І ПРАФЭСЫЯНАЛЬНАЙ РАБОТЫ павінна быць пастаўлена ў самай рэзкай форме. Студзеньскія вынікі па прамысловасьці павінны стаць у цэнтры ўвагі ўсіх вытворчых партыйных арганізацый і прымусіць у шмат раз паляпшыць іх штодзённую работу. ПАЛІТЫЧНАЕ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ — БАЯВАЯ ЗАДАЧА КОЖНАЙ ПАРТЫЙНАЙ І КАМСАМОЛЬСКАЙ ЯЧЭЙКІ. З ГЭТАГА ПУНКТУ ПОГЛЯДУ ПАВІННА РАСЦЭНЬВАЦЦА ЎСЯ ІХ РАБОТА.

Выкананьне прамфінпляну — мерка работы нашых ПРАФСАЮЗАЎ. Вынікі першага месяца з упэўненасьцю гаворыць, што перабудова работы прафсаюзаў у адпаведнасьці з пастановамі XVI партзьезду яшчэ далёка ня скончана. Зьмена арганізацыйнай структуры прафсаюзаў на аснове разбуйненьня, максымальнага ахопу ўсіх патрэб прамысловасьці, канкрэтызацыі кіраўніцтва ўдарніцкім рухам, падняцьця барацьбы за працыўсыпліну на вышэйшы ўзровень — павінна паслужыць выходным пунктам для рашучага ўсебаковага паляпшэньня прафработы, далейшага ажыцьцяўленьня пёзунгу — «тварам да вытворчасьці».

Сур'ёзнае недавыкананьне прамысловасьцю студзеньскага пляну павінна прыкаваць да сябе ўвагу партыйных, прафсыянальных і гаспадарчых арганізацый. Трэба неадкладна ўзяцца за ліквідацыю прарыву. Жорсткі адпор павінны атрымаць усе прыхільнікі раўненьня на «вузкія месцы», якія імкнуцца прыкрыць імі сваю нездольнасьць змагацца за лінію партыі. Лепшым адказам гэтым элемэнтам зьяўляюцца ПОСЬПЕХІ РАДУ ПЕРАДАВЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ БССР, ЯКІЯ ПЕРАВЫКАНАЛІ СВАЕ ПРАМФІНПЛЯНЫ («ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК», «БАЛЬШАВІК», ФАБРЫКА ІМЯ ДЗЯРЖЫНСКАГА, ГУТА «КАСТРЫЧНІК» І РАД ІНШ.).

Пытаньні паляпшэньня якасьці ўсёй работы прамысловасьці, мабілізацыі мас на зьнішчэньне прарываў — павінны быць пастаўлены на плязо нажа. Планы нашы — рэальны. Мы маем усе магчымасьці для іх выкананьня. Трэба толькі па-баявому падыйсьці да выраішэньня гэтай задачы. Першы квартал павінен даць 100 проц. выкананьня заданьняў. Гэтыя сто процантаў мы завоюем, і ў барацьбе з апартунізмам усіх копераў пераложым шляхі для далейшых перамог рашаючага году пяцігодкі.

Напорна біцца за бальшавіцкія тэмпы калектывізацыі

За апошнія месяцы, пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б), мы дабіліся значных посьпехаў у галіне калгаснага руху. Дзесяткі тысяч новых бядняцка-серадняцкіх гаспадарак уступілі на выпр

В. МОЛАТАЎ

Прамова на Ўсесаюзнай канфэрэнцыі прамысловых работнікаў

Гаспадарчыя прадпасылкі і выкананьне народна-гаспадарчага пляну на 1931 год

Тав. Молатаў, спатканы бурнай авацыяй, пачынае з таго, што перадае канфэрэнцыі будаўнікоў сацыялістычнай індустрыі бальшавіцкае прывітаньне ад Савету Народных Камісараў.

— Я палкам згодзен,—гаворыць тав. Молатаў,—а усімі ўстаноўкамі, якія даў тав. Арджанікідзэ ў сваім дакладзе. Апрочкі далі шмат каштоўнага, што трэба ўдзіць у далейшай рабоце ВСНГ.

Я хачу перш за ўсё спыніцца на асноўных гаспадарчых прадпасылках, ад якіх залежыць выкананьне пляну трэцяга году пяцігодкі. Такіх асноўных прадпасылак тры: першая — збожжа, другая—транспарт, трэцяя—апал.

Мы цяпер мець гаворым пра збожжа. Збожжам мы ў асноўным забясьпечаны і нам часам і здзецца, што гэта пытаньне не патрабуе да сябе асаблівай увагі. Аднак, гэта азначала-б, што даволі хутка забываем урокі мінулага мінулага. Праўда, мы дабіліся посьпехаў у павышэньні ўраджаю і росьце збожжазагатовак. У мінулым годзе мы загатовілі 1 мільярд пудоў збожжа. У гэтым годзе ўжо загатоўлена кала 1.300.000.000 пудоў. Ня гледзячы на гэтыя буйнейшыя посьпехі, ня трэба забываць, што збожжазагатоўчы плян у цэлым яшчэ ня выкананы. Даволі спасланца на тое, што апрача забясьпячэньня гадавога пляну (на харчэньне і іншыя патрэбы), нам трэба скласьці 150-мільённы ня ўтыкальны збожжавы фонд. Зараз мы выканалі плян яшчэ на паўтора 90 проц. і гэта нас ні ў якім выпадку ня можа задаволіць. Калі мы не загатовім нават толькі 10 проц. збожжазагатоўчага пляну, дык гэта складзе такую колькасьць збожжа, якая будзе роўна ўсяму 150-мільённаму збожжавому фонду. Значыцца, пакуль мы ня маем ноўных 100 проц. збожжазагатовак—мы ня маем у пазітыўнай першай, я-б сказаў асноўнай, прадпасылкі выкананьня трэцяга году пяцігодкі. Між іншым, мы павінны думаць ужо зараз аб забясьпячэньні новага ўраджаю, а для гэтага трэба даць поўнасьцю на пляне як пасеўныя, так і ўборачныя машыны сельскай гаспадарцы. Адсюль відаць, што спрадвечнае забясьпячэньне гэтай асноўнай гаспадарчай прадпасылкі ў многім залежыць ад самой прамысловасьці.

Другая прадпасылка—ТРАНСПАРТ. Урад, у асобе Саўнаркома, і Цэнтральны Камітэт партыі з выключнай увагай займаліся за апошні час праблемай транспарту. Усе віды транспарту—чыгуначны, рачны, марскі—маюць выключнае значэньне для выкананьня наредна-гаспадарчага пляну. Перабой у рабоце транспарту вельмі адбіваецца на ўсёй прамысловасьці. Чым хутчай ідзе разьвіцьцё народнае гаспадаркі, тым у большай меры павялічваецца патрабаваньні да транспарту. Мы арабілі ў гэтым годзе кэрэнны паварот у сэнсе росту капітальных укладаньняў у транспарт усіх відаў. Побач з забясьпячэньнем высокіх тэмпаў разьвіцьця прамысловасьці мы змаглі цяпер накіраваць больш сродкаў на транспарт, а ўжытымі партыяй і савецкімі органамі мерамі, ужо ў бліжэйшыя месяцы спадзяемся дабіцца рашучага ўзруху ў разьвіцьці чыгуначнага і водзнага транспарту.

Трэцяя прадпасылка выкананьня пляну—АПАЛ. Апал—адно з вузкіх месц у нашай народнай гаспадарцы. Праблема апалу—узяць у першую чаргу і, перш за ўсё з Данбасу. І тут мы павінны дабіцца рашучага палепшаньня, рашучага пералому, асабліва ў справе ажыцьцяўленьня задач мэханізацыі здабычы апалу.

У галіне апалу, як і ў галіне транспарту, мы маем яшчэ не малыя рэшткі шкодніцтва. Іменна ў гэтых галінах шкодніцы імкнуліся з асаблівай энэргіяй нанесьці здрадніцкія ўдары сацыялістычнаму будаўніцтву. Вось чаму сюды трэба накіраваць найбольшыя сілы, каб пераадолець труднасьці і неадкладна дабіцца рашучага пералому.

— Я не хацеў-бы, аднак,—гаворыць тав. Молатаў,—каб мяне ня правільна разумелі, быццам мае прадпасылкі носяць характар — лніх-сьціпаправільных умоў, г. зн., каб хто-небудзь не пачаў разважаць так: «Пакуль не дадуць апалу, пакуль не наладзіцца транспарт і г. д.—«Не вышні те, потерпите»... Такое разуменьне было-б у корані няправільным, небальшавіцкім. Ня трэба чакаць, пакуль кожная з гэтых прадпасылак будзе ажыцьцёўлена на 100 проц.—кожны на сваім месцы павінен дапамагчы іх ажыцьцяўленьню, на кожным гаспадарчым вучастку загатоўчага, транспартнага, апалавага і наогул гаспадарчага фронту павінна быць барацьба за выкананьне народна-гаспадарчага пляну ў цэлым. Паміж усімі вучасткамі гаспадарчага фронту існуе ўзаемная залежнасьць і ад выкананьня задач на адным вучастку залежыць посьпех выкананьня пляну на другім. Ад гэтага залежыць і ажыцьцяўленьне на справе ўсіх гаспадарчых задач, якія я назваў асноўнымі прадпасылкамі.

Тав. Молатаў пераходзіць далей да асноўнага пытаньня, пастаўленага тав. Арджанікідзэ ў яго дакладзе,—да пытаньняў аб гаспадарчым разьліку і дагаворных адносінах.

Тав. Молатаў выказвае ўпэўненасьць, што пераважная большасьць канфэрэнцыі стаіць на пункце погляду правільных вываду, якія даў на гэтым пытаньні тав. Арджанікідзэ і спыняецца толькі на выступленьні т. Сьмірнова, які выказаў на гэтым пытаньні няправільныя погляды, яўна не адпавядаючыя і самым практычным інтарэсам справы.

Тав. Сьмірноў прапановаў вышэ-цэнтралізаваць прамысловае забясьпячэньне, стварыць «громоздкие» ўстановы тыпу Чуссаснабарма пры ВСНГ, УПВОСО —пры НКПВ, якія існавалі ў перыяд ваеннага камунізму. Такая настаноўка яўна спрашчае пытаньне. Яна памылковая і з арганізацыйнага і з эканамічнага пункту погляду.

Ці-ж мы зараз знаходзімся ў такіх умовах, якія былі ў 1918-20 гг.? Матэды таго перыяду зусім не адпавядаюць сучасным задачам. Зараз прамысловасьць, прыкладна, у 15 раз перавышае ўзровень продукцыі, скажам, 1920 году. Цэнтралізаваць забясьпячэньне прамысловасьці на прыкладзе таго часу ў цяперашні перыяд разгорнутага сацбудаўніцтва было-б зным бюракратычнай заценяй, якая да таго-ж практычна ня можа быць ажыцьцёўлена. З эканамічнага пункту погляду прапанова аб цэнтралізацыі прамысловасьці па тыпу Чуссаснабарма эпохі ваеннага камунізму, калі ў яго ня было ні цяперашняга шырокага тавараабароту, ні гаспадарчых разьліковых адносін прамысловасьці, азначае на справе прынцыповую памылку, якая вядзе да адмаўленьня НЭП'у. Партыя патрабуе правядзеньня прынцыпу гаспадарчага разьліку ва ўсёй рабоце прамысловасьці і гэта палкам адпавядае цяперашняй, хаця ўжо і апошняя, стадыі НЭП'у. Прапанова аб Чуссаснабармаўскай арганізацыі прамысловага забясьпячэньня выходзіць з процілеглага прынцыпу — адмаўленьня і гаспадарчага разьліку і самога НЭП'у.

Пытаньне аб гаспадарчым разьліку—старое пытаньне. Па гэтым пытаньні ў нас ёсьць надрабязная дырэктыва Цэнтральнага Камітэту партыі яшчэ ад 5-га сьнежня 1929 году. Яна была апублікавана ў «Правде» і іншых газэтах 14-га сьнежня таго-ж году. Я маю на ўвазе настанову ЦК «аб рэарганізацыі кіраўніцтва прамысловасьцю». У радзе пунктаў гэтай настановы проста ўказваецца на тое, што прадпрыемствы і аб'яднаньні прадпрыемстваў павінны весьці сваю работу на аснове гаспадарчага разьліку. Прачытайце гэту настанову і вы пераканаецеся, што прынцып гаспадарчага разьліку тут выложан у аснову кіраўніцтва ўсёй прамысловасьцю.

З таго часу прайшло год і два месяцы і зараз выяўляецца, што гэта настанова ЦК да гэтага часу не ажыцьцёўлена. Рэарганізацыя кіраўніцтва прамысловасьцю па дырэктыве ЦК паткнулася на вялізарнае супраціўленьне ў нашым гаспадарчым апараце — і ўніз і ўверсе. Главкізм, які ў сучасных умовах зьяўляецца адным з яркіх рознавіднасьцяй бюракратызму, супроць якога і была накіравана настанова ЦК, аказаўся жывучым. Між тым, ці-ж абстаноўка не пацьвердзіла поўнасьцю правільнасьці гэтай настановы ЦК? Бязумоўна, пацьвердзіла. Што азначае гаспадарчы разьлік? Гаспадарчы разьлік азначае, што мы пішчэ працуем ва ўмовах НЭП'у, што НЭП мы зжываем; але яшчэ ня зжылі. Вось чаму настанова ад 5 сьнежня 1929 году павінна быць поўнасьцю праведзена ў жыцьцё, ня гледзячы на «левакіцкіе» звычкі некаторых нашых гаспадарнікаў. Гэтага патрабуюць інтарэсы сацыялізму.

Скажэньні ў гаспадарчым разьліку т. Молатаў ілюструе двума прыкладамі: недапушчальнай зэпэзычанасьцю па зарплаце, якая (запазычанасьць) зараз ліквідуецца, і паспабленьнем увагі да ўнутрызаводзкага плянаваньня. Тав. Молатаў паказвае на недапушчальнасьць такіх фактаў, калі пасобныя гаспадарчыя органы не забясьпечваюць своечасовай выплаты зарплаты рабочым і служачым. Адсутнасьць правільнасьці заводзкага плянаваньня сьведчыць аб недазвальняючай настаноўцы кіраўніцтва ў нашых прадпрыемствах. Гаспадарчы разьлік і ўстанаўленьне дагаворных адносін паміж прадпрыемствамі па выкананьні заказу павінны палепшыць мэтады работы прамысловасьці зьверху данізу, забясьпечыць адзначальле ў прамысловым кіраўніцтве і дапамагчы вышчэньню бюракратызму.

Даючы, тав. Молатаў адзначае, што ён цікавіўся, ці атрымала настанова ЦК ад 5 сьнежня 1929 г. афарбленьне на савецкай лініі — на лініі Саўнаркому і ВСНГ. Выявілася, што па гэтым пытаньні вялася на працягу 14 месяцаў нерашэна паміж СНК і ВСНГ, якая... да гэтага часу яшчэ ня скончана. Гэты прыклад паказвае, наколькі дрэнна ў нас пастаўлена праверка выкананьня, як шмат мы пішам і выносім пастаноў і як слаба сочым за іх правядзеньнем у жыцьцё, прынамсі, за правядзеньнем у жыцьцё асноўных і важнейшых з гэтых пастаноў.

— Памеснь пісаць пастаноў, а добрую пастанову ажыцьцяўляць на справе, на практыцы, па сутнасьці, — гаворыць тав. Молатаў пры агульных воплесках усяе залі.

Кажуць, што ў нас зададзе шмат рэарганізацый, што мяж зададзе часта рэарганізуем нашы ўстановы.

Але трэба зразумець, што гэтыя рэарганізацыі выклікаюцца не адным імкненьнем да ўсё новага і новага, а дыктуюцца бурнымі тэмпамі росту нашай гаспадаркі. Трэба зразумець, што гэтыя рэарганізацыі патрэбны для таго, каб лепш абслугоўваць інтарэсы шырокіх мас, наблізіць нашы органы да мас, палегчыць ажыцьцяўленьне задач кіраўніцтва. Падзел наркаматаў НКПВ і Наркамгандлю, разбурэньне прафсаюзаў, умацаваньне усіх асноўных гаспадарчых камісарыятаў і асабліва ВСНГ і Дзяржпляну — усё гэта мае адну мэту: падпарадкаваць нашу работу задачам сацыялістычнага будаўніцтва на новым яго этапе. І мы бачым, што нашы гаспадарчыя органы, ВСНГ і інш. ужо зараз ідуць сьмела наперад у справе выкананьня буйнейшых гаспадарчых задач.

Пры гэтым нам трэба накіраваць асаблівую увагу на праверку выкананьня, на правядзеньне ў жыцьцё пастаноў партыі, пастаноў савецкай улады. Тут нам трэба падцягнуцца.

Мы расьцем, наш гаспадарчы арганізм умацоўваецца і гэта прымушае нас перастройвацца. Галоўнае — мець ясную перспэктыву. Гэту перспэктыву дае нам партыя сваёй палітычнай разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце. Але польга трацім часу.

Прайшоў студзень. Першы месяц трэцяга году пяцігодкі прайшоў недазвальняюча, але на аснове перабудовы нашай работы, на аснове праведзенага ўмацаваньня нашых гаспадарчых органаў і на аснове тых пастаноў, якія будуць ухвалены на гэтай канферэнцыі, пры падтрыманьні рабочых мас мы зможам і павінны, бязумоўна, забясьпечыць посьпех першага кварталу, поўнасьцю выканаць план усяго трэцяга году пяцігодкі і дабіваца перавыкананьня гэтага пляну. (Апошнія словы тав. Молатава выклікаюць бурныя воплескі).

Пленум Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі КП(б)Б скліканецца на 15 ЛЮТАГА г. г.

ЦКК КП(б)Б.

Барацьба з праваапартуністычнай практыкай —ВАЖНЕЙШАЯ ЎМОВА ВЫКАНАНЬНЯ ПРАГРАМЫ ТРЭЦЯГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ

Вылазка кулацкіх агентаў на лямцава-вяровачнай фабрыцы сустрэла бязьлітасны адпор з боку партыйных мас

МАЦНЕЙ АГОНЬ ПА АГЕНТАХ КЛЯСАВАГА ВОРАГА—ПРАВЫХ І „ЛЕВЫХ" АПАРТУНІСТАХ, МАЦНЕЙ НАЦІСК НА КУЛАКА

Вышэй бальшавіцкую непрымірымасьць

Трэці год пяцігодкі зьявіцца годам завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР. Партыя ўступіла ў гэты год, разграміўшы ідэйна і арганізацыйна правых і «левых» апартуністаў, іх бяспрынцыпныя правааппортуністычныя ілюзіі і ня ўсіх, і ня ўсіх, і ня ўсіх,

Апэрацыйныя зводкі барацьбы за прамфінплян

ТЭМПЫ СТУДЗЕНЯ

не гарантуюць выкананьня прамфінпляну

МНОГІЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ ЯШЧЭ НЕ ПАКОНЧЫЛІ З АРГАНІЗАЦЫЙНЫМІ НЕПАЛАДКАМІ

Апэрацыйнае кіраўніцтва—пад рабочы кантроль

Гэта завецца „плянаваньнем"

На Гомельскай швэйнай фабрыцы «Камінтэрн» два цэхі шылі бялізну. Раптам прыбывае загад Белшвэабʼяднаньня расфармаваць гэтыя цэхі быццам у сувязі з тым, што не хапае адпаведнага асартымэнту сырцу. Так і зрабілі.

Але гэтымі днямі ў Гомель прыехаў прадстаўнік аб'яднаньня з навіной, што ў Менску арганізуецца цэх па пашыўцы бялізны, у сувязі з тым, што ўвесь час паступае шмат сырцу для бялізны і, з прычыны спыненьня работы нашых двух цэхаў, няма куды яго дзявать. Прадстаўнік трэсту папрасіў выдаць яму старыя лекалы, спэцмалюнкі, узоры бялізны і нават... спэцпрадаўнікоў. Ясна, што за чатыры месяцы з моманту ліквідацыі цэхаў бялізны, ні лекалаў, ні ўзораў, ні спэцпрадаўнікаў не засталося, бо апошнія пераведзены на іншую работу. Вось вам прыклад умелага «плянаваньня».

А вось яшчэ адзін факт. Некалькі дзён як рэзкі, якія працуюць на бавоўняных тканях, маюць прастоі ў сувязі з несваячасовай дастаўкай сырцу. Адміністрацыя паслала ў аб'яднаньне 8 тэлеграм, але адказу не атрымала. Раптам прыбывае тэлеграма з запытаньнем—ці працуюць нашы бавоўняныя цэхі... Чым гэта тлумачыць?

Брыгада «Зьвязды».

Баяліся рамонту...

Апошнія дні тацьвергай пяцідзёвкі студзеня прынесьлі папяровай фабрыцы «Спартак» пералом у выкананьні прамфінпляну. Першая папяровая машына, якая дае ¾ усёй прадукцыі фабрыкі, нарэшце пачала выпускаць сваю норму. Брыгада сетачніка Буйніцкага першая перавыканала вымепную праграму, выпрацаваўшы замест 10.300 тон—10.750 тон масьлёнкі. Дапамог капітальны рамонт першай машыны, які адміністрацыя адцягвала з працяг усяго асобнага кварталу, ічыся прарыву ў гэтым квартале !) Пад націскам рабочых машына ў пачатку студзеня была спынена. Ударнікі сьлесары ўзялі на сябе абавязак скараціць рамонт да мінімуму. І свой абавязак яны выканалі—праз 6 дзён машына стала, як новая.

Такімі-ж тэмпамі трэба зараз адрамантаваць другую машыну. Трэба таксама паскорыць уключэньне электратоку з першай Белдрэс імя Сталіна.

Недавыкананьне прамфінпляну выклікала напружанае фінансавае становішча фабрыкі. Між тым, на складах фабрыкі знаходзіцца 13 вагонаў гатовай паперы. Раней паперу нельга было вывезьці з-за непадачы вагонаў, а калі падалі вагоны, аказалася, што вузкакалейка засыпана сьнегам. Загадчык гаспадаркі восеньню не паклапаціўся абараніць вузкакалейку шчытамі.

Бад.

Запалкавая прамысловасьць—у хвасьце

Запалкавая прамысловасьць студзеньскую праграму выканала далёка нездавальняюча — усяго на 85,5 проц. Фабрыка «Вэзувій» выканала праграму на 82,8 проц., фабрыка «Дніпро» — на 61,1 проц., «Чырвоная Бярэзіна — на 94 проц., «Пралетарская перамога» — на 87,6 проц. і фабрыка «Х Кастрычнік» — на 90,9 проц.

Фанэрныя заводы пры гэтых фабрыках выкапалі праграму — пры фабрыцы «Вэзувій» на 64 проц. і пры фабрыцы «Дніпро» — на 70,7 проц. «Чырвоная Бярэзіна» выканала праграму па вырабе сядзеньняў для крэслаў на 75,6 проц., а цэх па вырабе ватэрпасаў — на 72,3 проц.

Такім чынам, уся прамысловасьць запалкавага аб'яднаньня закончыла студзень са значным невыкананьнем праграмы.

Замацаваць зрух

МАГІЛЕЎСКАЯ ШВЭЙНАЯ ФАБРЫКА ІМЯ ВАЛАДАРСКАГА скончыла асобны квартал з вялікім прарывам (праграма была выканана на 86 проц.). А за 20 дзён студзеня праграма выкананa усяго на 54 проц.. Гэта тлумачыцца тым, што на фабрыцы няма сапраўднага сацспаборніцтва. Работа ідзе самацёкам. Няма ўліку ўдарнікаў і з імі не праводзіцца ніякай работы. У цэхах ёсьць шмат нявуявязк.

Адміністрацыя на ўсё гэта спаба разгуе, але ўленінскія дні рабочыя-ударнікі заявілі, што так далей цягнуцца ня можа. Рабочыя абвесьцілі сацспаборніцтва паміж агрэгатамі на атрыманьне пераходнага сьцягу імя парткалектыву.

ПЯЦІДНЕЎКА 21-25 СТУДЗЕНЯ ПАКАЗВАЕ ЗНАЧНЫ ЗРУХ. Праграма выканана НА 106,64 проц. Рабочыя заяўляюць, што ўзятых тэмпаў яны не здадуць.

Але і адміністрацыя павінна зьнічыць недахопы ў цэхах, нявязкі ў істужцы, прастоі і г. д. Адначасова трэба адзначыць, што і якасьць прадукцыі палепшылася. З 3.600 адзінак за 6 дзён было ўсяго 3 адзінкі браку.

Фабрыка ўключылася ва ўсесаюзны паход за якасьць прадукцыі.

СТРАЛЬЦОЎ.

Калі будзе дрот?

Кардонная фабрыка імя Вароўскага (Сураскага раёну) перавыканала праграму студзеня. Але на фабрыцы назіраюцца значныя адносіны да адгрузкі гатовай прадукцыі. У аддзелачным цэху ёсьць больш 150 тон кардону на суму каля 40 ТЫС. РУБ. Гэты цэх цалкам загружан кардонам. Упакоўка спынена з-за недахвату дроту. Кардон перавозіцца на склад незапакаваным, а для ўпакоўкі ЗНОЎ ПЕРАВОЗІЦЦА Ў АДДЗЕЛАЧНЫ ЦЭХ, што выклікае вялікія выдаткі і брак.

Заказ на дрот быў дан яшчэ жніўні Белпаперы і менскаму прадстаўніцтву Саюзпаперы. Адкак, не гледзячы на некалькі напамінаньняў і тэлеграм, дрот да гэтага часу не атрыман.

Фабрыка імя Вароўскага знаходзіца на аддалечасьці 65 кілёмэтраў ад станцыі Віцебск. Кардон павінны быць вывезен у зімовы час, бо ўвесну, калі ня будзе санной дарогі, вазка прадукцыі стане амаль немагчымай.

РАБКОР.

Прарыў не ліквідаваны

ВЫКАНАНЬНЕ ПРАГРАМЫ Ў СТУДЗЕНІ ПА БАБРУЙСКІМ КАМБІНАЦЕ ПАКАЗВАЕ, ШТО ПРАРЫВЫ ЯШЧЭ НЕ ЛІКВІДАВАНЫ. ЛЕСАЦЭХ КАМБІНАТУ ВЫКАНАЎ МЕСЯЧНЫ ПЛЯН НА 102,2 ПРОЦ., ЛЕСАЗАВОД № 6 — НА 107,6 ПРОЦ., ЛЕСАЗАВОД № 7 — НА 83 ПРОЦ., ФАНЭРНЫ ЦЭХ КАМБІНАТУ — НА 90,4 ПРОЦ., ФАНЭРНЫ ЗАВОД ІМЯ ТОМСКАГА — НА 86,1 ПРОЦ.

М.

Аздараўленьне кіраўніцтва—вылечыла завод

ГУТА «КАСТРЫЧНІК» НА ПРАЦЯГУ БОЛЬШ 2-Х ГОД ПРАЦАВАЛА З ВЯЛІКІМІ ПРАРЫВАМІ. СЫСТЭМАТЫЧНА НЯ ВЫКОНВАЮЧЫ ПРАМФІНПЛЯНУ, ВЫЛОЕ АПАРТУНІСТЫЧНАЕ КІРАЎНІЦТВА ЗАВОДУ (ДЫРЭКТАР ПІСАРАЎ) ЗАУСЕДЫ ПЭСЫМІСТЫЧНА АЦЭНЬВАЛА СТАНОВІШЧА І НЕ ДАВАЛА РАЗГАРНУЦЦА ІНІЦЫЯТЫВЕ РАБОЧЫХ.

ЛІСТАПАД І СЬНЕЖАНЬ УЖО ДАЛІ ВЫКАНАНЬНЕ ПРАГРАМЫ НА 98,100 ПРОЦ. РАШАЮЧЫМ МЕСЯЦАМ СТАЎ СТУДЗЕНЬ, ЗА ГЭТЫ МЯСЯЦ АСНОЎНЫ ЦЭХ — ГУТА — ПЕРАВЫКАНАЎ ПРАМФІНПЛЯН ПА ЎСІХ ПАКАЗАЛЬНІКАХ. НАВАТ ПЕРАВОЕ З ДАСТАЎКАЙ СЫРЦУ НЕ АСЛАБІЛІ ЭНТУЗІЯЗМУ РАБОЧЫХ.

НА ВЕЧАРЫ, ПРЫСЬВЕЧАНЫМ ПРАВЕРЦЫ АЖЫЦЦЯЎЛЕНЬНЯ АДОЗВЫ ЦК УсеКП(б), 35 ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ ПАДАЛІ ЗАЯВЫ АБ ЖАДАНЬНІ ЎСТУПІЦЬ У ПАРТЫЮ, 25 — У КАМСАМОЛ. БОЛЬШ 200 ЧАЛАВЕК ДАДАТКОВА САМАЗАМАЦАВАЛІСЯ НА ПРАДПРЫЕМСТВЕ ДА КАНЦА ПЯЦІГОДКІ. ДАДАТКОВА НА ПАЗЫКУ «ПЯЦІГОДКА—ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ» САБРАНА КАЛЯ 10 ТЫС. РУБ. ПЕРАХОДЫ ЧЫРВОНЫ-СЬЦЯГ ПЕРАДАНЫ МАЛЯРНЫМ ЦЭХАМ ГУТЫ ЗА ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ. У ЛЕНІНСКІЯ ДНІ ПАДАНА ЯШЧЭ 40 ЗАЯЎ АБ ЖАДАНЬНІ ЎСТУПІЦЬ У ПАРТЫЮ І 35 —У КАМСАМОЛ.

П.

Ударнік фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна»

Студзень даў 102 проц.

ШВЭЙНАЯ ФАБРЫКА ІМЯ ДЗЯРЖЫНСКАГА (Бабрыйск) выканала праграму за студзень на 102 проц. Але ўнутрыфабрычны месячны плян, складзены з разьбіваньня на ліквідацыю прарыву асобнага кварталу, выканан толькі на 84 проц.

А.

Добры пачатак

АРШАНСКІ ДРОТА - ЦЬВІКОВЫ ЗАВОД «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК» ВЫКАНАЎ ПРАГРАМУ ЗА СТУДЗЕНЬ НА 112 ПРОЦ. АПОШНЯЯ ДЗЕСЯЦІДНЕЎКА ДАЛА ЗНАЧНАЕ ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ПРАГРАМЫ ПА ВЫРАБЕ БУДАЎНІЧЫХ ЦЬВІКОЎ — НА 49,4 ПРОЦ. УСЯГО ЗА МЕСЯЦ ПРАГРАМА ПА ВЫРАБЕ БУДАЎНІЧЫХ ЦЬВІКОЎ ПЕРАВЫКАНАНА НА 27,8 ПРОЦ. ІНШЫЯ ВІДЫ ПРАДУКЦЫІ ТАКСАМА ВЫПУШЧАНЫ ЗВЫШ ПРАГРАМЫ, ЗА ВЫКЛЮЧЭНЬНЕМ ГАЛЯНТАРЭІ, ПРАГРАМА ПА ЯКОЙ ВЫКАНАНА НА 98,7 ПРОЦ.

Няма іават тытульных сьпісаў

Хаос у забесьпячэньні матар'яламі

Становішча з ліквідацыяй кулакоў, Там, дзе кулак абкладзены, ён ня ўлічвае сезону ў Бабруйшчыне прымушае біць трывогу. Як з боку цэнтральных устаноў, так мясцовых будаўнічых арганізацый тэма выразных устаўнак, што і дзе трэба будаваць. Дагэтуль няма канкрэтна зацьверджаных цэнтральных лімітаў. Няма нават і тытульных сьпісаў будаўніцтва.

Праекты, якія атрымліваліся на лініі ўзмацненьня ад свайго цэнтру, на месцы амаль што не прапрацоўваліся, а прыстасоўваліся да ўмоў раёну. На 15 студзеня забесьпячэньне матар'ялмі — дрэннае. На нарадах, што адбываў гарсавет на ўдарны квартал, ніводнага няма.

На будаўніцтве малочнай формы — поўны зрыў работ. Рабочых звальняюць за адсутнасьці лесаматар'ялаў. Забесьпячэньне цьвікамі, жалезам, трубамі — усім дрэннае. Мясцовыя матар'ялы (цэгла, пясок і камень) таксама да гэтага часу не загатаўляюцца.

Транспарт Камунтрэсту, які ёсьць у горадзе, ня можа забясьпечыць усіх патрэб, і ёсьць выпадкі, калі з-за непадвозу падпалу, спыняецца работа. Агульнага пляну перавозак і запатрабаваньняў транспартных сіл на 1931 г. ні адна з будаўнічых кантор ня мае.

Фінансавае становішча будаўнічай канторы Белжылсаюзу надта напружанае, бо кантора карыстаецца сродкамі, што атрымліваюцца ад работадаўцаў за мінулы год, а іншых сродкаў ня мае. У выніку работа не разгортваецца.

Трэба адзначыць, як ненармальнае зьявішча, што ў Бабруйску значная колькасьць будаўнічых работ праводзіцца непасрэдна гаспадарчымі органамі. У 1931 годзе мяркуецца арыентовачна дзевяссот агульную суму будаўніцтва да 7,7 млн. руб., з яіх на долю гаспадарчага спосабу будаўніцтва прыходзіцца каля 60 проц. Такое зьявішча вядзе да разбуханьня штатаў гаспадарчых органаў, адсутнасьці патрэбнага ўліку і не дае будаўнічага эфэкту. Раённая КК-РСІ прапанавала ЦРК і райвыканкамам ліквідаваць свае будаўнічыя аддзелы і заказы перадаць будаўнічым канторам. Усе гэтыя факты паказваюць, што апрача тых недахопаў, якія мы мелі летась, падрыхтоўка да будаўнічага сезону на 1931 год пагражаючая. РайКК-РСІ па гэтым пытаньні вынесла рад канкрэтных прапаноў, якія патрэбна будаўнічым арганізацыям правесьці ў жыцьцё, загадзя абгаварыўшы гэта пытаньне на рабочых сходах, і прыцягнуць да гэтай работы грамадзкасьць. Галоўнае месца ў рабоце павінны заняць пытаньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

І. ДОНІН.

РЭАЛІЗАВАЦЬ

адозву партыі і ўраду аб кантрактацыі

Давядзеньне плянаў і ссылка насеньня—адны з асноўных мер у падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясны

Рашуча змагацца з апартуністамі, якія прабуюць скараціць пасеўныя плошчы тэхнічных і кармавых культур

Пад суд

за зрыў загатовак насеньня кармавых і гародных культур

Белкалгаснасеньсаюз ня раз даваў пакаяньні раёнам аб разгортваньні загатовак насеньня траў корэньплодаў і гародных культур.

Некаторыя раённыя працаўнікі замест выкананьня дырэктыў і мабілізацыі ўсіх унутраных рэзэрваў з запасаў насеньня, якія маюцца ў раёне, выступаюць з апартуністычнымі разважаньнямі аб тым, што «насеньня ў раёне няма, выкананць плян немагчыма і трэба насеньне завезьці з-за межаў раёну».

Прыкладам бязьдзейнасьці ў справе загатовак насеньня траў і гародных культур можа служыць КОПЫЛЬСКІ РАЕН, дзе амаль нічога ня зроблена.

За бязьдзейнасьць і нядбайныя адносіны да загатовак насеньня кармавых і гародных культур пракурору перадана справа старшыні Копыльскага райвыкансаюзу т. ТРУМПАКАЧА для прыцягненьня яго да судовай адказнасьці. Загадчыку Копыльскага райзэ таг. Пархомчыку абвешчана суровая вымова з папярэджаньнем.

Райвыкансаюзу прапанавана зараз-жа разгарнуць загатоўкі насеньня кармавых і гародных культур, забясьпечыўшы поўнае выкананьне заданьня ў вызначаны тэрмін.

Выкрываць бюракратаў,

якія перашкаджаюць безадкладнаму ажыцьцяўленьню адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб кантрактацыі

«Зьвязда» пачала праверку таго, як дзяржаўныя, гаспадарчыя, грамадзкія арганізацыі адгукнуліся на гістарычную адозву СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб кантрактацыі яравых культур пасеву 1931 г., што робіцца гэтымі арганізацыямі для забясьпячэньня рэалізацыі гэтай адозвы.

Учора брыгадамі «Зьвязды» былі абсьледаваны НКГандлю і Белільнасаюз.

У Белільнасаюзе адозва аб кантрактацыі абмяркоўвалася габінэтным нарадкам.

Ні ў ячэйцы, ні па мясцкоме, ні па агульным сходзе супрацоўнікаў адозва не абмяркоўвалася.

Сакратар ячэйкі Белільнасаюзу на запытаньне, што імі зроблена, адказаў:

— Мы зараз заняты чысткай савецкага апарату і таму няма часу абмяркоўваць гэту адозву.

Толькі 10-га лютага адозва будзе абмяркоўвацца на партыйным сходзе. Ня лепш справа і ў мясцкоме.

Высьвятляецца, што Белільнасаюз да гэтага часу не надрукаваў тыпавых дагавароў па кантрактацыі, а іх патрэбна каля 25-30 тыс. экземпляраў. Дагэтуль друкарні яшчэ ня здаў заказ для друкаваньня.

Не абмяркоўвала адозвы і калегія Наркамгандлю. Ячэйка і мясцком Наркамснабу таксама не палічылі патрэбным абмяркаваць важнейшую дырэктыву вышэйшых партыйных і ўрадавых органаў.

Брыгада «Зьвязды»:
СЬМІРНОЎ, КОЎШЫК, БЯЗЗУБЕНКА, ПАГАРДЗЕЛЬСКІ.

Арганізатары калгаснага прыліву

На 1-га кастрычніка 1930 г. у Вушацкім раёне было 18 калгасаў, якія аб'ядналі 827 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Партыйныя і савецкія арганізацыі Вушацкага раёну ня сьмяліся на гэтых дасягненьнях.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія саветаў пройшла пад знакам далейшага росту калгаснага руху і арганізацыі калгаснага прыліву. У асобным квартале ў Вушацкім раёне было арганізавана 12 новых калгасаў. З 1-га па 18-га студзеня арганізаваліся яшчэ 4 калгасы. У старыя калгасы ўступіла 150 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Клінені, Завячэльні і Мазырскі сельсаветы ідуць папераду па калектывізацыі. Ячэйкі гэтых сельсаветаў вельмі шмат зрабілі ў справе арганізацыі новага калгаснага прыліву.

Завячэльні сельсавет на сёньшні дзень ужо калектывізаваны на 80 проц.

Калгас «Чырвоная Попаччына» пакідае даказаў паўкольнаму сялянству перавагі калектыўнай гаспадаркі. На справаздачным сходзе праўленьня гэтага калгасу ўся вёска Завыдрыня, у ліку 30 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, падала заявы аб прыняцьці ў калгас.

Дапамогчы добра наладжанай рабоце, наглядзецца прыліў і ў калгасы «Чырвоны Усход» і «Чырвоны Кастрычнік».

На апошнім месцы па калектывізацыі знаходзяцца Весьніцкі, Кубліцкі і Чэрапашчынскі сельсаветы, дзе арганізавана ўсяго па адным калгасе. Партыйныя ячэйкі гэтых сельсаветаў фактычна нічога не зрабілі для далейшага разгортваньня калектывізацыі.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія, якая зараз пачалася ў калгасах раёну, павінна прайсьці пад знакам бальшавіцкай падрыхтоўкі да веснавой сяўбы і яшчэ больш шырокага разгортваньня тэмпаў калгаснага руху.

Г. Я.

Калгасы Віцебшчыны

павялічваюць пасеўную плошчу гародніны

СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА ВІЦЕБСКАГА РАЁНУ У ГЭТЫМ ГОДЗЕ НАБЫВАЕ САДОВА-ГАРОДНЫ І МАЛОЧНА - ЖЫВЕЛАГАДОЎЧЫ ЎХІЛ. ВЫТВОРЧЫЯ ПЛЯНЫ ДА КАЛГАСАЎ ДАВЕДЗЕНЫ ЯШЧЭ 1-га СТУДЗЕНЯ. БОЛЬШАСЬЦЬ КАЛГАСАЎ ВЫСУНУЛІ СУСТРЭЧНЫЯ ПЛЯНЫ, У ЯКІХ ЗА ЛІК ЗБОЖЖАВЫХ КУЛЬТУР І ЧАСТКОВА ІЛЬНУ ЯНЫ ПАВЯЛІЧЫЛІ ПАСЕЎНУЮ ПЛОШЧУ ГАРОДНІНЫ. КАЛІ Ў МІНУЛЫМ ГОДЗЕ ПА КАЛГАСАХ БЫЛО ЗАСЕЯНА 86 ГЭКТ. ГАРОДНІНЫ, ДЫК У ГЭТЫМ ГОДЗЕ МЯРКУЕЦЦА ЗАСЕЯЦЬ 800 ГЭКТ.

ПЛОШЧУ ЯРАВОГА КЛІНУ ВЫЗНАЧАНА ПАВЯЛІЧЫЦЬ НА 14 ТЫС. ГЭКТ.

ШТО ДАТЫЧЫЦЬ ІНДЫВІДУАЛЬНАГА СЭКТАРУ, ДЫК ДАГЭТУЛЬ ПЛЯНЫ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ ЯШЧЭ НЕ ДАВЕДЗЕНЫ НЯ ТОЛЬКІ ДА ДВАРА, АЛЕ НАВАТ І ДА ВЁСАК. БОЛЬШАСЬЦЬ СЕЛЬСАВЕТАЎ НЕ РАЗГАРНУЛА МАСАВА-РАСТЛУМАЧАЛЬНАЕ РАБОТЫ СЯРОД БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ МАС ВЁСКІ АБ ЗАДАЧАХ І ЗНАЧЭНЬНІ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ.

ВЫКЛЮЧЭНЬНЕМ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ЕЛАГІНСКІ СЕЛЬСАВЕТ, ЯКІ ЗДОЛЕЎ МАБІЛІЗАВАЦЬ УВЕСЬ ВЯСКОВЫ АКТЫЎ ВАКОЛ ВЫКАНАНЬНЯ ЗАДАЧ ВЕСНАВОЙ КАМПАНІІ. У ВЫНІКУ ЕЛАГІНСКІ САВЕТ ВЫСУНУЎ СВОЙ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН; ЗНАЧНА ПАВЯЛІЧЫЎШЫ ЗАДАНЬНЕ ПА ЗАСЕВЕ ГАРОДНІНЫ.

О. Ш.

Нарэшце прачнуліся

У Запольскім сельсавеце, Сураскага раёну, да апошняга часу амаль нічога не рабілася ў справе арганізацыі далейшага росту калгаснага руху. За ўвесь асенні перыяд у калгасы сельсавету ня ўступіла амаль ні адна гаспадарка. Сярод бядняцка-серадняцкіх мас не вялося ніякай растлумачальнай работы.

Толькі ў апошні час зроблен некаторы зрух. Прэзыдыум сельсавету выехаў у вёску Шляхоткі, дзе на сваім пасяджэньні заслухаў справаздачу калгасу аб выніках гаспадарчага году і аб падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясны. У пасяджэньнях пленуму прымала ўдзел шмат беднякоў і сераднякоў—адпасобнікаў.

Пасьля справаздачы ў калгас уступіла 26 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Арганізаваны ініцыятыўныя групы ў вёсках Захаронкі і Плоткі.

КУРАКОЎ.

52 калгасы

ня склалі вытворчых плянаў

У Койданаўскім раёне падрыхтоўка да веснавой сяўбы разгортваецца вельмі марудна. З 66-ці калгасаў, якія ёсьць у раёне, вытворчыя пляны складзены толькі ў 14 калгасах. Сельсаветы і дагэтуль яшчэ не давялі плянаў веснавой сяўбы да вёсак. Да рамонту інвэнтару як у калгасах, так і ў адпасобных гаспадарках яшчэ ня прыступлена.

Ня гледзячы на тое, што Койданаўскі раён мае жывёлагадоўчы ўхіл, загатоўка насеньня траў і агародных культур ідзе вельмі марудна. Райвыкансаюз загатовіў толькі ўсяго 5 проц. патрэбнага насеньня траў.

Пяцярэнні тэмпы падрыхтоўкі да сяўбы ў раёне ні ў якім разе не забясьпечваюць выкананьня вызначаных заданьняў. Раённыя ўстановы, у першую чаргу райзэ, райвыкансаюз і МТС павінны зараз-жа мабілізаваць усю грамадзкасьць раёну на выкананьне задач другой бальшавіцкай вясны.

Нускультар.

Павялічыць нормы прэміяваньня здатчыкаў ільну

Прэміі за апрацоўку ільну

У парадку выкананьня пастановы прэзыдыуму ЦВК ад 2-га лютага за подпісам наркамснабу тав. Балціна і старшыні Белвапісаюзу тав. Хаскіна разасланы ўсім райгандлям і райспажыўтаварыствам наступная тэлеграма:

У мэтах лепшага скарыстаньня тавараых фондаў для ўзмацненьня ільназагатовак прапануецца неадкладна павялічыць нормы прэміяваньня здатчыкаў ільну—калгасаў да 50 проц. прантаварамі, бядняцка-серадняцкіх гаспадарак—да 40 проц., забясьпечыць прэміяваньне выключна мануфактурай.

Рабочыя саўгасаў, калгасьнікі, якія будуць апрацоўваць лён, прэміруюцца прантаварамі ў разьмеры 20 проц. зарплаты.

Шырока абвесьцеце аб гэтым масам калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў. Забясьпечце стварэньне належнага пералому ў ільназагатоўках.

К. ГЕЙ.

Напярэдадні другойбальшавіцкай вясны

У сваім дакладзе на XVI зьезьдзе УсеКП(б) тав. Сталін, закранаючы пытаньне аб труднасьцях нашага росту, падкрэсьліў, што яны выклікаюцца ня так знанымі «абʼектыўнымі прычынамі», а што зьяўляецца пытаньнямі клясавага парадку, што яны вынікаюць у рэзультаце супраціўленьня клясава-варожых элементаў. Аб тым, што гэта іменна так, мы можам прасьлядзіць ня толькі ў рабоце па разгортваньні прамысловага будаўніцтва, а і ў рабоце па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі. Шкодніцтва і супраціўленьне кулацтва—вось галоўныя крыніцы нашых труднасьцей. І трэба сказаць, што мясцовыя партарганізацыі не заўсёды ўмеюць, як належыць, мабілізаваць масы на перамаганьне гэтага супраціўленьня кулацтва.

Палітыка партыі ў адносінах кулацтва вызначана дэвізам «ліквідацыя кулацтва як класы на базе суцэльнай калектывізацыі». Гэта значыць, што ў тых раёнах і мясцовасьцях, дзе процант калектывізацыі складае больш паловы бялядняцка-серадняцкіх гаспадарак, мы будзем непасрэдна праводзіць ліквідацыю кулацтва, як класы. Гэта значыць, што там, дзе суцэльная калектывізацыя ішчэ не дасягнута, мы праводзім палітыку абмежаваньня экспрапрыятарскіх тэндэнцый і выцісканьня кулацтва, але ўжо пад кутом погляду непасрэднай падрыхтоўкі да ліквідацыі кулацтва, як класы. З гэтых агульных палажэньняў вынікаюць і пры даведзеньні цьвёрдых заданьняў да кулацкіх і заможных гаспадарак. Даводзячы цьвёрдыя заданьні да кулака і заможніка, мы ўжываем такія меры спагнаньня, якія даюць нам права канфіскаваць усю маемасьць у кулака, пазбавіць яго права карыстацца зямлёю і ўсімі сродкамі вытворчасьці. У адносінах да заможных гаспадарак мы, зразумела, меры спагнаньня ўжываем іншыя, чым да кулацкіх гаспадарак (штрафныя, судовыя і г. д.

У якой ступені раёны выкарыстоўваюць гэтыя вялізарныя правы?

На гэта пытаньне трэба адказаць адмоўна. Раёны свае правы скарыстоўваюць у вельмі нязначнай ступені. Асноўная прычына нашых труднасьцей у галіне абожжазагатовак ільназагатовак, лесазагатовак і ў галіне правядзеньня асноўных мерапрыемстваў партыі вёсцы зьяўляецца тое, што рад раёнаў арганізацый ня здолеў паставіць пытаньне аб кулаку так, як паказала партыя.

Рашаючым моментам для пасьпяховасьці работы на выкананьні асноўных палітычна-гаспадарчых задач партыі вёсцы зьяўляецца палітыка цьвёрдых заданьняў кулацкім і заможным гаспадаркам. Як-жа гэты сродак скарыстоўвалі раённыя арганізацыі і ўстановы? Па пытаньні ільназагатовак мы імкнуліся праверыць наколькі раёны выкарысталі даныя ім правы. На дзьве тэлеграмы ЦК па гэтым пытаньні зо раёнаў зусім не далі вестак, або далі іх далёка неадавальняючыя. Вязумоўна, што не адказалі тыя раёны, у якіх па гэтым пытаньні не знайшлося чаго адказаць. У таму адсутнасьць адказу з гэтых раёнаў мы павінны разглядаць, як імкненьне прыкрыць тое, што палітыка ў адносінах да кулака на практыцы праводзіцца ў гэтых раёнах неадавальняюча.

Раёны ў колькасьці 32 далі весткі няздавальняючыя. І вось з гэтых даных відаць, што на кулацка-заможных гаспадаркі ў некаторых раёнах накладаецца 0,7 проц., 0,8 проц., 0,9 проц. агульнага размеру загатовак. Такое імкненьне становішча ў Асьвейскім, Ветрынскім, Крупскім і інш. раёнах. І гэта пры ўмовах, калі ў раёне 5-7 проц. кулацка-заможных гаспадарак.

Як-жа раёны дабіваліся таго, каб кулацка-заможныя гаспадаркі выканалі даныя ім заданьні? Лічыць гаворыць аб тым, што гэта выкананьне ў радзе раёнаў недапушчальна дрэннае. Так, у Бялыніцкім раёне з кулацка-заможных гаспадарак даныя ім заданьні спагнаны толькі на 7,2 проц., у Расонскім раёне—на 10 проц., у Асіпавіцкім—11,6 проц. і г. д. Толькі ў 16 раёнах з кулацка-заможных гаспадарак заданьні спагнаны больш, як на 50 проц. Пры такім становішчы, бязумоўна, загатоўкі насьпіхова прахоліць на будуць. Раёны не змаглі ўхапіцца за асноўнае зьвяно. У значнай частцы раёнаў цьвёрдыя заданьні зусім не даведзены да кулака і больш таго, у раёне сёй-той пакат з членаў партыі імкнецца давесьці, што ў іх зусім ішчэ не ставіцца пытаньне аб ліквідацыі кулакоў. Там, дзе кулак абкладзены, ён абкладзен невытэрпальна, а там, дзе і кулака не спагняецца. Напрыклад, у Пятрыкоўскім раёне было абкладзена ўсяго 8 гаспадарак. Потым пашукалі і знайшлі 40 буйных кулацкіх гаспадарак (былых паўабшарнікаў, арандатараў і г. д.).

У рэзультаце такой «работы» па мабілізацыі мас на ўзмацненьне націску на кулака калектывізацыя ў гэтым раёне самацёкам. Загатоўкі бульбы выкананы толькі на 26 проц., абожжазагатовак—на 46 проц. і мабілізацыя сродкаў—на 20%. Усе гэтыя паказальнікі надчымай нізкіх і яны характарызуюць вельмі выразна дзейнасьць раённай арганізацыі.

Выкананьне нашых чарговых палітычна-гаспадарчых кампаній на вёсцы знаходзіцца ў простай залежнасьці ад таго, колькі раённыя камітэты партыі, нашы парт'ячэйкі змаглі правесьці правую палітыку ў адносінах да кулацкіх і заможнай верхавін вёскі. Наша ўзьнятьне з клясавым ворагам на вёсцы ідзе і свае непасрэдныя адносіны да мабілізацыі і вынікаў веснавой пасяўной кампаніі. У тых раёнах, дзе ішоў апартуністычны настрой, якія ішоў мягчымасьці партыйнай арганізацыі правільна да змаганьня з кулацкімі элементамі на вёсцы, тыцяны правяліць і калектывізацыю і іншую сяўбу.

Станіцы калектывізацыі, якая павінна ацэнтральнае месца у нашым шэфоце, мы сустракаемся з пырокага распаўсюджанымі апартуністычнымі настрэ мясцох. Апрача таго, што асобныя райпартарганізацыі ня могуць спраўце на фронце змаганьня з кулаком, ніку леташніх нерагібаў у радох ных партарганізацый склаліся такія настрої: «Калі возьмешся за калектывізацыю, дык можна пазбавіць памылкі нерагібы мінулага году». Апынуўшы палоне такіх настроў, таварышы, часьцей чакаюць, не працуюць спадзяючыся на тое, што бядняцкія масы самі калектывізуюць прыкладах некаторых раёнаў мы вельмі выразна бачым, на «лі нагібы мінулага году повт-

варяцца зараз у апартуністычную пасыўнасьць. Гарадоцкі раён належыў да ліку тых, якія ў эпоху «головокружения от успехов» калектывізаваўся па... 100,6 проц. Зараз гэта адзін з адсталых раёнаў у рэспубліцы на калектывізацыі, там толькі 6-7 проц бядняцка-серадняцкіх гаспадарак ахоплена калгасамі. У гэтым раёне, дзе перагібаў у мінулым годзе было больш, чым у якім-небудзь іншым, зараз найбольш выразна праяўлена права-апартуністычная стаўка на самацёк, боязнь падыйсьці шчыльна да разгортваньня калектывізацыі. Прыклад Гарадоцкага раёну пацьвярджае, наколькі права-апартуністычныя ўхілы песна ўжываюцца з «левымі» загібамі. Тыя, хто ў мінулым годзе дапусьцілі «левыя» загібы, сёлета нічога ня робяць, тармозяць справу разгортваньня калектывізацыі.

Права-апартуністычныя адносіны да калгаснага будаўніцтва зьяўляецца найбольш распаўсюджанай хваробай, якая вельмі ярка кідаецца ў вочы. Аднак, у асобных выпадках мы сустракаемся і з рэцыдывамі «левых» загібаў у рабоце мясцовых партарганізацый.

Гэтыя перагібы перш за ўсё вынікаюць ў пераважнай калгасаў у саўгасы і прыгарадныя гаспадаркі. Цэнтральны Камітэт КП(б)Б не адзін раз даваў вусім выразную дырэктыву раённым арганізацыям на гэтым пытаньні. Аднак, ня гледзячы на гэта і наперакор гэтым дырэктывам, да апошняга часу мы маем выпадкі, калі калгасы «добраахвотна» пераводзіліся ў саўгасы і прыгарадныя гаспадаркі. Прычым, гэта «добраахвотнасьць» была такой, што калгасьнікі скардзіліся ў Калгасцэнтр, ЦК КП(б)Б і інш. цэнтральныя органы і прасілі пазбавіць гэтага пераводу іх гаспадары «на вышэйшую сацыялістычную ступень».

Для таго, каб разьвіць і дабіцца больш шпаркіх тэмпаў калектывізацыі, а гэтага мы павінны дабіцца, бо сучасны ход разгортваньня калгаснага руху нас не здавальняе, нам трэба: па-першае, прасьцей правільную палітыку ў адносінах да кулацкіх элементаў на вёсцы; па-другое, перамагчы і вынішчыць апартуністычныя настрої ў радох нашых вясковых партарганізацый (стаўка на самацёк);

па-трэцяе, трэба паставіць у парадак дня пытаньне барацьбы за палепшэньне якасьці калгаснае работы, за палепшэньне і ўмацаваньне існуючых калгасаў.

Ня гледзячы на ўсе рагаткі, кулак усётакі пралазіць у калгасы. У Барысаўшчыне ў калгасах выяўлена 85 проц. кулацкіх гаспадарак, якія былі раскулачаны ў раёне. У іншых раёнах калгас

МЕСЯЧНІК ЛЕСАЗАГАТОВАК

ХОПіЦЬ ПАПЯРОВАЙ ШУМіХі

Патрэбна штодзенная бальшавіцкая напорнасьць у барацьбе за выкананьне і перавыкананьне лесазагатоўчых пляна́ў трэцяга году пяцігодкі

Патрэбны рашучыя меры

БАРЫСАЎ, 5. (Па тэлефону). Месячнік лесазагатовак не распачынаўся. Загатоўкі будаўнічых матар'ялаў і дроў праходзяць неданучальна марудными тэмпамі. Пляны вывазак сарваны.

Прудбаранскі кучлесгас павінен быў загатовіць дзелавой драўніны 28 тыс кубамэтраў, дроў — 10 тыс. раўмэтраў.

Загатоўлена на сёньняшні дзень дзелавой драўніны 2.361 кубамэтр і дроў толькі 400 раўмэтраў.

З лесу вывезена дзелавой драўніны замест 59 тыс. кубамэтраў усяго 2.665, дроў замест 13 тыс. раўмэтраў — 130.

Такое становішча і ў астатніх 18 вучлесгасах Барысаўскага леспрамгасу.

Партыйныя арганізацыі на цікавяцца справамі лесазагатовак і ня кіруюць работай лесазагатоўчага апарату.

Сельсаветы ўпарта ня выконваюць сваіх плянавых заданьняў. Рад сельсаветаў зусім не прыступілі да вывазкі. Цьвёрдыя нормы да кулацка-заможных двароў не даведзены.

Райвыканком гэтым правам правага апартунізму на практыцы не дае адпору і фактычна патурае яшчэ большаму пагнубленьню прарываў на лесазагатоўчым фронце.

Лагойскі райвыканком, які прымацован да Барысаўскага леспрамгасу, адмовіўся даць фурманкі для перавозкі загатоўленых лесаматар'ялаў і дроў.

Лесазагатоўчы апарат працуе дрэнна. Ніякай культурна-выхаваўчай работы лесарубамі і возчыкамі не вядзецца. Ударніцтва і сацспаборніцтва на вучлесгасах адсутнічае. Працдысцыпліна пастаўлена дрэнна. Райспажыўтаварыства не спраўляецца з задачай забесьпячэньня лесарубаў і возчыкаў прадуктамі харчаваньня і прамтаварамі. Няма праддуражу.

Патрэбны рашучыя меры для ліквідацыі далушчанага прарыву.

Партыйныя ячэйкі, камсамол і сельсаветы павінны ў першую чаргу пабаявому ўзяцца за работу па выкананьні лесазагатоўчых пляна́ў, вызначаных у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

Рабкор Барысаўскі.

Пляны ня выконваюцца

БЯРЭЗІНА, 5. (Наш кар.). Бярэзінскі леспрамгас гапебна ня выконвае плянаў лесазагатовак.

Квартальнае заданьне 1931 г. за студзень месяц на загатоўках дзелавой драўніны выкапана на 10.6 проц., па загатоўцы дроў—на 2,6 проц.

Вывезена з лесу дзелавой драўніны, замест 322 тыс. кубамэтраў—толькі 52.390. Дроў вывезена замест 76.980 раўмэтраў,—толькі 6.902.

Маса калгасьнікаў, бядняцка-серадняцкая частка вёскі не мабілізаваны вакол гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі.

Сельсаветы бязьдзейнічаюць, заданьняў сваіх ня выконваюць.

Партыйныя, камсамольскія, прафсаюзныя і іншыя грамадзкія арганізацыі стаяць у баку ад лесазагатовак.

Уся работа на лесазагатоўчым фронце праходзіць самацёкам.

Баргалін.

Так працаваць нельга

ВУЗДА, 5. (Па тэлефону). Пляны лесазагатовак па Вузьдзенскім раёне пад рэальнай нагрозай зрыву.

Апарат лесазагатоўчых арганізацый засьмечан чужым элемэнтам. У вёсцы Ракашынцы сядзяць 4дзесятніку, з якіх адзін пазбаўлен выбарчых правоў, другі— былы дзэртыр, трэці —выключан з партыі. Гэтыя горагагатоўшчыкі бязьдзейнічаюць, займаюцца п'янствам, пускаючы ўсялякія плёткі аб пераальнасьці лесазагатоўчых пляна́ў.

Райвыканком ня лічыць патрэбным займацца лясными справамі.

Пастановы райарганізацый аб стварэньні сталай арцелі і пабудове 4-х сталовак ня выкананы.

Лесбел--адкажы!

Тэлеграма

ГЛУСК, 5. (Па тэлеграфу). Паўнейшае адсутнічаньне аўса, нашільнікаў—зрывае выкананьне пляна́ў лесазагатовак і вывазкі.

Лесбел, пасадзейнічай хутчэйшаму атрыманьню вызначанай нам нормы аўса і нашільнікаў.

Каган.

„Пачакайце трошкі—дамо"

РЭЧЫЦА, 5. (Па тэлефону). На складах чыгуначных станцый ляжыць 1.600 кубамэтраў (100 вагонаў) асіны для вырабу запалак.

Гэтую асіну патрэбна адгрузіць Рэчыцкай запалкавай фабрыцы «Дніпро», якая не мае сырцу і знаходзіцца пад нагрозай астаноўкі.

Чыгуначнае «начальства», на шматлікія просьбы Рэчыцкага і Хойніцкага леспрамгасаў даць пляцформы, бюракратычна адказвае:

«Пачакайце трошкі—дамо».

Належныя органы павінны моцна ўдарыць па такіх фактах бюракратызму, апартуністычных адносін да забесьпячэньня заводаў сырцом.

Лагун.

НА УСЕБЕЛАРУСКАЙ НАРАДЗЕ РАЙЖАНАРГАНІЗАТАРАЎ

2-га лютага пры ЦК КП(б)Б адкрылася першая Усебеларуская нарада райжанарганізатараў. За гэтыя дні нарада заслухала і абмеркавала даклад тав. Гантмана аб выніках студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б і даклад тав. Міцькова аб весьнавой пасеўнай кампаніі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Спрэчкі ўдзельнікаў нарады зводзіліся да таго, каб у большай меры разгарнуць работу на месцах па мабілізацыі актыўнасьці работніц, бяднячак, калгасьніц і сераднячак-аднаасобніц на пасьняховае выкананьне задач трэцяга году пяцігодкі, якія вызначаны сьнежаньскім пленумам ЦК УсеКП(б) і студзеньскім пленумам ЦК КП(б)Б.

Радам прыкладаў работы на прадпрыемствах, у саўгасах і калгасах, з практыкі правядзеньня гаспадарча-палітычных кампаній прамоўцы ілюстравалі рост актыўнасьці працоўных жанчын у змаганьні за выкананьне прамфінпляну на прадпрыемствах, за сацыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі і ліквідацыю кулацтва, як клясы, на аснове суцэльнай калектывізацыі.

— Працоўныя жанчыны вёскі—гаворыць тав. Юцкова (Прапойск)—бяруць актыўны ўдзел у правядзеньні гаспадарча-палітычных кампаній. Мы мелі такія прыклады, калі жанчыны-делегаткі, у парадку грамадзкасьці, почуу адпружалі бульбу, зарыхтаваную для пралетарскіх цэнтраў. Кепска толькі, што работа сярод жанчын, работа делегацкіх сходаў недаацэньваецца радам парт'ячэек і некаторых райкомаў. Недаацэнка гэтай работы часткова наглядаецца і з боку нашага друку. Цэнтральныя газэты невыстарчальна асьвятляюць работу сярод працоўных жанчын.

— Наколькі груба ігнаруюцца на месцах дырэктывы партыі аб разгортваньні работы на далучэньні да больш актыўнага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве вясковых працоўных жанчын відаць з таго,—адзначае тав. Собалева (Гарадок),—што да гэтага часу нельга дабіцца згоды сакратара РК выбараў делегацкіх сходаў. Тав. Баброва (Чэрыкаў) падала такі прыклад, што сакратар райкому катэгарычна адмовіўся ставіць пытаньне на бюро РК аб рабоце сярод жанчын, заявіўшы: «зацьвярджай ты пляны са сваімі жанчынамі, а ў мяне ёсьць больш важныя справы». Аб аналёгічных фактах апартуністычнай недаацэнкі работы сярод жанчын з боку РК гаварыла і тав. Грушнаўская (Дубровна).

У сваёй прамове тав. Мітпіна (Чашнікі) адзначала факты ігнараваньня пасобнымі ячэйкамі дырэктыў партыі аб павялічэньні ліку працоўных жанчын у складзе саветаў. Ёсьць такія факты і ў нашым раёне, калі з ліку 21 новаабранага члена сельсавету—толькі адна жанчына. Да вылучэньня працоўных жанчын на кіруючую савецкую работу паглядаюцца фармальныя адносіны. Вылучэнка тав. Дымлер у сваёй работе ў РВК яе мела ніякай дапамогі і замест стварэньня спрыяючых умоў для работы, замест дапамогі—яе зьнялі, як неаправдаўшую сябе на рабоце.

У зьвязку са шпаркім ростам прамысловасьці,—гаворыць тав. Эпштэйн,—у складзе рабочых павялічваецца колькасьць работніц, між тым, на палепшэньне іх бытавых умоў ня ўсюды зьвяртаецца ўвага. У Віцебску будуецца новая фабрыка, на якой будзе працаваць больш 4 тыс. работніц, а будаўнічыя арганізацыі нават ня ўлічылі патрэбнасьці пабудаваць пры гэтай фабрыцы адпаведнага памяшканьня для ясьлей.

З вялікай прамовай на нарадзе выступіла тав. Масьцюкова (прадстаўнік ЦК УсеКП(б), якая падрабязна застанавілася на задачах работы сярод новага складу работніц, нядаўна прыцягненых да больш актыўнага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве працоўных жанчын вёскі.

Л. П.

МЕНСК

Напярэдадні X усебеларускага зьезду саветаў

Прэзыдыум ПВК зацьвердзіў часовую мандатную камісію X усебеларускага зьезду саветаў у наступным складзе: т. т. Вансоўскі (старшыня камісіі), Гурыневіч, Гурэвіч, Левін, Дзічкоўскі, Валодзька, Ляўковіч, Майзіт, Васілевіч і Гуткін.

***

X ўсебеларускі зьезд саветаў будзе адбывацца ў памяшканьні кіно «Культура».

***

Ва ўсіх наркаматах арганізуюцца «сталы даведак» з дзяжурствам адказных работнікаў для абслугоўваньня делегатаў зьезду рознага роду даведкамі.

***

Наркаматы і цэнтральныя ўстановы рыхтуюць да зьезду плякаты і дыяграмы, якія будуць ілюстроўваць дасягненьні прамысловасьці, сельскай гаспадаркі і культурнага будаўніцтва БССР за апошнія гады.

***

Камэндантам X усебеларускага зьезду саветаў назначан начальнік кіраўніцтва міліцыі БССР і крымвышуку тав. Каравін.

Выбрана праўленьне „Белрыбаксаюзу"

Старшыня праўленьня— т. Кушнярэў

Першы ўсебеларускі зьезд рыбацкай кааперацыі, які нядаўна адбыўся ў Менску, вынес рад практычных пастаноў.

У спрэчках на зьезьдзе выявілася, што ў рад арцеляй пралезьлі клясававароглыя элементы. Зьезд пастанавіў правесьці ў 1931 г. чыстку арцеляй ад чужых элемэнтаў.

Зьезд прызнаў неабходным арганізаваць у бягучым годзе трохмесячныя курсы па падрыхтоўцы старшынь рыбацкіх арцеляй.

Рыбацкая кааперацыя Беларусі напічвае зараз 130 арцеляй, якія аб'ядноваюць каля 2.500 рыбакоў. Каля 500 рыбакоў не ахоплены яшчэ арцелямі. Зьезд пастанавіў правесьці кантрактацыю ўлову гэтых рыбаноў-адзіночак.

Выбрана праўленьне новага кааперацыйнага саюзу рыбацкіх арцеляй «Белрыбаксаюз» у складзе т. т. Кушнярова, Шпэйера, Гарбунова, Сяліванова, Альпяровіча, Бейчыкава і Альфяровіча.

Дэлегатамі на ўсесаюзны зьезд рыбацкай кааперацыі выбраны т. т. Кушнярэў, Сьпірыдонаў (рыбак), Альфяровіч (рыбак), дырэктар Белрыбы Сяліванаў і Дубавец.

***

На першым арганізацыйным пасяджэньні праўленьня «Белрыбаксаюзу» былі выбраны: старшынёй праўленьня тав. Кушнярэў (рабочы, вылучэнец) і намы старшыні тав. Шпэйер.

Мэталісты абвясьцілі „дзесяцідзеньнік" масавага паходу ў дапамогу другой бальшавіцкай сяўбе

ЦП САЮЗУ МЭТАЛІСТАЎ АБВЯСЬЦІЛА З 15-ГА ПА 25-ГА ЛЮТАГА «ДЗЕСЯЦІДЗЕНЬНІК» МАСАВАГА ПАХОДУ Ў ДАПАМОГУ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЕ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ВЕСКІ.

У ЧАСЕ «ДЗЕСЯЦІДЗЕНЬНІКА» АРГАНІЗУЮЦЦА ВЕЧАРЫ, ПРЫСЬВЕЧАНЫЯ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ.

ЦП САЮЗУ АБВЯСЬЦІЛА КОНКУРС ПАМІЖ ПРАДПРЫЕМСТВАМІ НА ЛЕПШАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ «ДЗЕСЯЦІДЗЕНЬНІКА».

ПЕРШЫ ДЗЕНЬ «ДЗЕСЯЦІДЗЕНЬНІКА»—15-ГА ЛЮТАГА—БУДЗЕ ДНЕМ ПРАВЕРКІ ГАТОЎНАСЬЦІ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ МЭТАЛІПРАМЫСЛОВАСЬЦІ БССР ДА ЎДЗЕЛУ Ў ДРУГОЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЯСЬНЕ.

Сьвята чырвонаштандарцаў

НА ЎРАЧЫСТЫМ ВЕЧАРЫ РАБОЧЫХ ГАРБАРНІ „БАЛЬШАВІК"

4-га лютага ў памяшканьні гарадзкога тэатру адбыўся ўрачысты сход рабочых чырвонаштандарнай гарбарні «Бальшавік», прысьвечаны перадачы заводу пераходнага сьцягу ЦСПСБ.

Толькі няўхільнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, рашучая барацьба з апартуністамі ўсіх колераў, за бальшавіцкія тэмпы, шырокае разгортваньне сацыялістычных мэтадаў працы—спаборніцтва і ўдарніцтва,—прывялі рабочых гарбарні да чырвонай дошкі, да пераходнага сьцягу ЦСПСБ.

І гэта добра сабе ўявілі рабочыя чырвонаштандарнага. Рабочыя «Бальшавіка» абяцелі што, пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, яны пойдуць наперад да новых перамог.

— Мы былі і будзем лепшымі з лепшых,—так адказалі рабочыя атрымліваючы сьцяг.

Тут-жа на сходзе прэміраваны 103 лепшыя байцы за справу Леніна, адданыя змагары за пяцігодку за чатыры гады. Сярод прэміраваных рабочых-ударнікі з вялікім вытворчым стажам: ШАФАРАНОВІЧ, ЛІКЕР, КАВАЛЕЎСКІ, БЕЛОН, ШВАРЦ, ІАНДРАТОВІЧ І., ЛОМСКІ, ІВАКОЎ, ШАМЕЙГІК ВАЛЯНДОВІЧ, БАРТНОЎСКІ І БАЦЬВІНЬНІК.

З прывітаньнямі выступілі т. т. ГАНТМАН, ЧАРВЯКОЎ, ГНІЛЯКЕВІЧ.

У адказ на прывітаньні рабочыя абяцалі яшчэ вышэй узьняць сьцяг сацспаборніцтва і ўдарніцтва і на аснове гэтага ажыцьцявіць плян трэцяга рашаючага.

Сход паслаў прывітальную тэлеграму Нарыкамваенмору-Кліму Яфрэмавічу Варашылаву.

М. Н.

Асфальтаваньне вуліц

СНК даручыў прэзыдыуму гарсавету распрацаваць разам з Галсудартрансам пытаньне аб асфальтаваньні і гудраваньні цэнтральных вуліц Менску. Для гэтай мэты з Гомельскіх заводаў будзе вызначана гарсавету 2 млн. штук клінкеру. Адначасова СНК даручыў гарсавету распрацаваць пытаньне аб пабудове ў Менску клінкернага заводу.

Раёны яшчэ не атрымалі крэдытаў

Пляны крэдытаваньня загрузьлі ў... Дзяржбанку

У СУВЯЗІ З ПАВЕДАМЛЕНЬНЕМ НЕКАТОРЫХ РАЁНАЎ АБ ТЫМ, ШТО АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ РАДУ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ ТАРМОЗІЦЦА З-ЗА НЕВЫЗНАЧЭНЬНЯ КРЭДЫТАЎ, НАШ СУПРАЦОЎНІК ЗЬВЯРНУЎСЯ ЗА РАСТЛУМАЧЭНЬНЯМІ Ў БЕЛАРУСКУЮ КАНТОРУ ДЗЯРЖБАНКУ.

АКАЗАЛАСЯ, ШТО ПЛЯН КРЭДЫТАВАНЬНЯ ВЕСНАВОЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ ЯШЧЭ НЕ ДАВЕДЗЕН ДА РАЁНАЎ ЕН НЯ БЫЎ СВАЯЧАСОВА РАСПРАЦАВАНЫ ДЗЯРЖБАНКАМ.

ТОЛЬКІ ЗА СТУДЗЕНЬ ПЛЯН БЫЎ ПРАДСТАЎЛЕН НА ЗАЦЬВЯРДЖЭНЬНЕ СНК.

10 новых калгасаў--у падарунак зьезду саветаў

КЛІЧАЎ. (Наш кар.). Беднякі, батракі і сераднякі КЛІЧАЎШЧЫНЫ ў часе работы раённага зьезду саветаў АРГАНІЗАВАЛІ 10 НОВЫХ КАЛГАСАЎ, УНЕСЬЛІ 5.000 РУБ. АДНАРАЗОВАГА ЗБОРУ НА ГАСПАДАРЧЫЯ І КУЛЬТУРНЫЯ ПАТРЭБЫ.

У падарунак зьезду калгасьнікі бядняцка-сераднякія гаспадаркі арганізавалі чырвоны абоз, якім здалі 19.200 КГР. ЗБОЖЖА, 20.800 КГР МЯСА. Узялькікі чырвонага абозу абяцалі, што яны ва ўсеўзбраеньні стрэнуць другую бальшавіцкую вясну, яшчэ вышэй узьніміць сьцяг сацыяльнай калектывізацыі і, на гэтай аснове, ліквідацыі кулацтва як класы.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

— **Культпроп ЦК КП(б)Б.** 6 лютага, у 2 гадз. дня адбудзецца пасяджэньне секцыі партасьветы мэтадбюро ЦК КП(б)Б. Яўка абавязкова наступным т.т.: Модаль, Улазаў, Гаеўскі, Гурвіч, Макоўскі, Орліс, Каган, Яцкевіч, Голанд.

— 6-га лютага роўна ў 6 гадзін вечара ў залі пасяджэньняў Менгаркому КП(б)Б (3-ці паверх), склікаецца нарада ўсіх прапагандыстаў і выкладчыкаў па агульна адукацыйных прадметах, занятых як у гарадзкой вячэрняй сапартшколе, адзінай партшколе, так і ў групах на прадпрыемствах. Яўка абавязкова і без спасьпяненьня.

— **Дом Пісьменьніка.** 6-га лютага, у 6 гадз. веч. адбудзецца сход фракцыі БелАПП'у. Прысутнасьць партыцыў і камсамольцаў — членаў БелАПП'у абавязкова.

— **ЦС СВБ БССР.** Заняткі антырэлігійнага унівэрсытэту адбудуцца 6-га лютага, у 6 гадз. веч., у памяшк. галоўн. корп. унівэрс. гарадка, 2-гі паверх, пакой № 214. Наступным т.т., якія сьпынілі наведваньне унівэрсытэту, прапануецца зьявіцца на заняткі: Підчэнка, Салавкоў, Варабей, Гарлапоў, Сіротін, Завістовіч, Штанюк, Маісеў, Лёўшык, Барсукоў, Фарына, Брэгман, Каган З., Главацкі, Гарошка, Аляксандрава, Лібэрман, Пятрушкевіч, Яблонскі, Бэнэдзісон, Абрамаў, Юшкевіч. Ячэйкам СВБ прасячыць за акуратным наведваньнем заняткаў.

— **Да ведама ўсіх хатніх работніц** мясцкому № 2. У нядзелю, 8 лютага, у клюбе камунальнікаў адбудзецца агульны сход хатніх работніц. Усе наймальнікі павінны на гэты сход адпусьціць сваіх работніц на перавыбары ў гарсавет.

БДУ. 6 лютага ў 19 гадз., у актавай залі. — сход працаўнікоў БДУ па перавыбарах у гарсавет. Яўка абавязкова.

— 6 і 11 лютага адбудуцца агульны сходы ўтрымальцаў рабочых шэйна-фабрыкі «Кастрычнік» ў чырвоным куту ф-кі (Ленінская № 17) у 6 гадз. вечара. 6-II—1, 3 і 5 груп, 11-II—2 і 4 група. Парадак дня — выбары ў гарсавет. Просьба да ўсіх утрымальцаў наведаць сходы.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і галоўная контора Менск, Савецкая, 83.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	13-80	Начны рэдактар	6-12
Сакратар	10-74	Галоўная контора	7-31
Сэктар інфармацыі	6-19	Адзел падпіскі	7-31
		Сэктар абвестак	7-31

Умовы падпіскі (з дарэвым дадаткам „Прафрух")

На 1 мес.	—	1 р
„ 3 мес.	—	3 „
„ 6 мес.	—	6 „
„ 12 мес.	—	12 „

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

Плата за абвесткі:

За радок нонп. пасьля тэксту 50 к., іншы гарадзкія абвесткі—1 р. за радок. Пасьля тэксту—у два разы дарожэй. Кантэмэнтны рахунак выдавецтва № 52100601 у Дзяржбанку.

Абвесткі прымаюцца ў канторы выдавецтва „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая 83, 2-ы паверх, тэл. 7-31.

З сёньняшнім нумарам газ. «Зьвязда» падпісчыкам разасланы дадатак часопісі „ОГОНЕК" №№ 1, 2 і 3 за студзень 1931 г.

БЕЛАРУСКАЕ КІРАЎНІЦТВА СУВЯЗІ

— з 15|II—31 году —

адкрывае ў Менску фабзавуч сувязі,

які будзе мець тры аддзяленьні:

тэлефоннае, тэлеграфнае і радыё.

Для наступаючых патрабуюцца веды ў абсёме 6-ці клясаў сямігодкі: у першую чаргу прымаюцца рабочыя, дзеці рабочых, калгасьнікі, батракі і беднякі.

Стыпендыя вучням устанаўляецца—21 руб. Узрост для наступаючых ад 15 да 21 году.

ЗАЯВЫ ПРЫМАЮЦЦА да 10|II г. г.

Пры заявах павінны быць прыкладзены дакуманты: даведка аб узросьце, сацыяльным становішчы, адукацыі, месцы працы і аб становішчы здароўя.

Заявы накіроўваць: МЕНСК, Ленінская 36, сэктар кадраў Беларускага Кіраўніцтва Сувязі.

БЕЛКІРАЎНІЦТВА СУВЯЗІ.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
Новы мастацкі фільм вытворчасьці „Саюзкіно"
АМЭРЫКАНКА кіно-эпапэя ў 6 частках
Часопіс „Саюзкіно" № 75
Пачатак сэансу: 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м.
Каса адкрыта з 5 гадз. веч.

Кіно-тэатр „Культура"
ВЯЛІКАЕ КАНЦЭРТНАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ
арт. Маск. Мюзік-Холла. М. І. Дарская, Эмль Кемпэр.
2 Жэрвэ 2—зусім новы рэпэртуар
новы фільм сэзону ІГДЭНБУ
Пач. сэансаў у 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 20 м.
Каса—з 3 гадз.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
З прычыны вялікага посьпеху, 2-гі тыдзень
РУБІКОН драма ў 7 частках
Пачатак 1-га сэансу—6 гадз.
Каса—з 4 гадз. 30 м.

КІНО „Пралетары"
Кастацкі фільм паводле і замаху Пітэрам-Пайкэна
МАБУЛ
(Крывавы патоп) драма ў 9 частках. Штодзенна 4 сэансы. Пачатак: 1 с., 6 г. Каса адкрыта з 4 гадз.

КІНО „Юны Піянэр"
Новы дзіцячы фільм вытворчасьці ВУФКУ
ГАЗЭТЧЫКІ
кіно-фільм у 6 частках.
Пачатак сэансу у 1 гадз. дня
Каса адчынена з 12 гадз. дня.

КІНО „СПАРТАК"
2-гі тыдзень. Кіно Баявік
Барацьба гігантаў
драма ў 10 частках.
Пачатак сэансаў: 1 с.—7 г., 2 с.—9 г., 3 с.—11 г.
Каса—з 5 гадзін.

Паведамленьні ў чарговы нумар „ЗЬВЯЗДЫ" прымаюцца да 2 гадз. дня

Кіно-тэатр КУЛЬТУРА
СКОРА!
Новы фільм вытворчасьці САЮЗКІНО (трэст Белдзяржкіно)
САПРАЎДНАЕ ЖЫЦЬЦЁ
Рэжысэры: А. ГАЎРОНСКІ і О. УЛІЦКАЯ
Аператары: Д. ШЛЮГЛЕЙТ і Н. СОКАЛАЎ

Гукавы кіно-тэатр „Чырвоная Зорка"
ГЭТЫМІ ДНЯМІ
ВЯЛІКІ ГУКАВЫ ФІЛЬМ
13 ДЗЁН
СПРАВА „ПРАМПАРТЫ"
ЗДЫМКІ РАБІЛІСЯ ў дні судовага працэсу ў Маскве ў Калён. залі Дому Саюзаў з 25-XI—7-XII 1930 г.

ПЯТНІЦА, 6 лютага АДКРЫТЫ СПЭКТАКЛЬ Пачатак у 8 г.
Беларускі другі дзяржаўны тэатр
В. Кіршон.
РЭЙКІ ГУДУЦЬ
П'еса ў 5 дзеях, 9 абразох.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ
на 1-ы курс факульт, санітарна-гігіенічнага і пекава-прафіляктычнага Бел. Дзярж. Мэдычнага Інстытуту
АБВЯШЧАЕЦЦА з 5 па 25 ЛЮТАГА
Экзамэны з 25 лютага па 3 сакавіка.
Дырэктар Мэдінстытуту.

„ОГИЗ"
ВЫЙШЛА З ДРУКУ І ПАСТУПІЛА Ў ПРОДАЖ НОВАЯ КНІГА
М. ВЯЛІКОЎСКІ І І. ЛЕВІН
НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ПЫТАНЬНЕ
ХРЫСТАМАТЫЯ
Том першы
НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ПЫТАНЬНЕ Ў БУРЖУАЗНА-ДЭМАКРАТЫЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ І Ў ЭПОХУ ІМПЭРЫЯЛІЗМУ
(Кам. акадэмія. Ін-т савецкага будаўніцтва і права. Сэкцыя нац. пытаньня і нац. палітыкі). М. выд. Камакадэміі. 1931 г
Стар. 422. Цана 2 руб. 50 кап.
У першы том увашлі артыкулы: У. І. Леніна, І. В. Сталіна, Р. Люксэмбург, К. Каўцкага, О. Бауэра, Г. Сафарава і інш. разьмеркаваныя па разьдзелах: нацыя, Маркс і Энгельс, аб нацыянальным пытаньні, 2 інтэрнацыянал аб нацыянальным і калёніяльным пытаньні. Нацыянальнае пытаньне і пралетарыят у буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі. Нацыянальнае пытаньне ў перыяд імпэрыялістычнай вайны і інш. Пры разьдзелах уводныя артыкулы. Рад перакладных артыкулаў дан на расійскай мове ўпершыню.
З заказамі зварачацца ў Белдзяржвыдавецтва, Менск, Савецкая, 41, ва ўсе магазыны Кнігацэнтру «ОГИЗ'а» і «Коопкниги»

БЕЛТОРФУ (Менск. Рэвалюцыйная № 9)
патрэбны старшыня бухгальтары і рахункаводы.

Белрадыёцэнтру ПАТРАБУЕЦЦА МАШЫНІСТКА, якая добра ведае беларускую мову.
Аплата па згодзе.

У выпадку неакупатнага атрыманьня газэты ЗВАНЕЦЕ па тэлеф. № 15-42

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА — СЭКТАР КНІГАРАСПАЎСЮДЖАНЬНЯ.
КНІГІ
ДА ГАДАВІНЫ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

В. Аляксеў і І. Харыкаў.—Расказы бывалага кулямётчыка.	80 стар. 20 к.
Я. Быстрыцкі.—Брытва.	72 стар. 25 к.
В. Боргенс.—Дэзэртыр.	60 стар. 20 к.
А. Буйскі.—Рэйд.	120 стар. 40 к.
А. Буйскі.—Чырвоная армія на ўнутраным фронце.	80 стар. 23 к.
А. Буйскі.—Пад гул званоў.	106 стар. 20 к.
К. Варашылаў.—СТАЛІН і ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ.	44 стар. 6 к.
Я. Весьнін.—У бойках за Кастрычнік.	74 стар. 16 к.
А. Давыдаў.—Што такое мабілізацыя	44 стар. 12 к.
Л. С. Дасгцароў.—Палітработа ў Чырвонай арміі ў ваенны час.	240 стар. 1 р. 25 к.
А. Дзёмін.—Наладжаньне ціру для стралковых гурткоў.	50 стар. 15 к.
Жарскі.—Супроць вайны з СССР	14 стар. 3 к.
А. Касьцерыя.—Лётнік.	52 стар. 12 к.
А. Карнаў.—Радавы жоскіеў.	60 стар. 10 к.
В. Калтынін.—Барацьба за мір і Чырвоная армія.	46 стар. 10 к.
Б. Квасьніцкі.—Маноўраная шрапнэль.	44 стар. 10 к.
А. Клюеў.—ПЕРШАЯ КОННАЯ АРМІЯ.	66 стар. 15 к.
В. Вурдзюмаў.—Пад маскай прыяцеля.	78 стар. 15 к.
В. Лонцьеў.—Стралковы гурток і як яго наладзіць.	48 стар. 10 к.
Н. Лінёўскі.—Тэрытарыяльнік на вёсны.	44 стар. 8 к.
А. Ласной.—Тарас—артылерыст.	48 стар. 16 к.
Б. Львоў.—Баявая служба /дазораў.	94 стар. 40 к.
М. Мансімаў.—Аблога Сяргеёўскі	64 стар. 16 к.
М. Мансімаў.—Курсант Мувафар	74 стар. 23 к.
Г. Марозаў.—Абавязкі стралка на баявых прыкладах.	112 стар. 60 к.
А. Масьвіч.—Саветы ў барацьбе за мір.	70 стар. 15
М. Масьвін.—Падрыўнікі.	64 стар. 15
Я. Мурзін.—Што можа патрабаваць пяхота ад артылерыі.	88 стар. 20
П. Паўлоўскі.—Як Чырвоная армія рыхтуе бойца-грамадзяніна.	32 стар. 6
П. Панч.—Блакітныя шалёны.	168 стар. 40
С. Рабіновіч.—Малодшы камандзір і дысцыпліна ў Чырвонай арміі	70 стар. 3
С. Рабіновіч.—XVI зьезд УсеКП(б), абарона і Чырвоная армія	68 стар
Д-р А. Савельеў.—Першая дапамога пацярпеўшым ад паветра-хімічнага нападзе.	60 стар.
Д-р М. І. Сандзірскі.—Гігіена чырвонага бойца.	72 стар.
М. Н. Тухачэўскі.—Памятка чырвонаармейца маневрах.	34 стар.
Д. Фурманаў.—Кавец Чапаева.	80 стар.
Н. Харджыеў.—Асобная Далёка-Усходняя.	32 стар.
Н. Харытонаў. Чырвоная армія—меч пралетарскай дыктатуры.	38 стар.
Чупрانоў Н.—Абавязкі пераменнага складу тэрытарыяльных войск у перыяд памежкі.	44 ст 0 к.
Н. Чупраноў.—Камсамол на дапрызыўнікаў-падрыхтоўцы.	44 с 10 к.
Гр. Штэрн.—Апавяданьні старшыні Вах. пра палітраньведку.	40 с 10 к.
С. Юшкаў.—Выхад з бою.	32 с 10 к.
» —На абароне.	52 15 к.
» —У наступленьні.	48 15 к.
» —На выходзе.	54 20 к.
» —На выведцы.	56 17 к.
І. Яўцыхіеў.—Танкі і барацьба з імі.	58 35 к.

Продаж утвараецца ва ўсіх кнігарнях Белдзяржвыдавецтва і спажыўкаапэрацыі.

ІНСТРУКЦЫЯ
ДЛЯ ВЫДАЧЫ НАБОРНЫХ КАРТАК
працоўнаму насельніцтву гор. Менску.

1. Выдача наборных кн ижак пачынаецца 7 II—20 II—30
2. Выдача праводзіцца ў наступным парадку: працоўныя на прадпрыемствах, уваходзячых у сьпісы №№ 1, 2, атрымліваюць карткі на сваіх прадпрыемствах, а таксама члены сям'і—утрыманцы.
3. Усе іншыя працоўныя АТРЫМЛІВАЮЦЬ НАБОРНЫЯ КАРТКІ ў пунктах у актаў, раёнаў міліцыі і інтэрнатаў, бо ных дамох, пасёлка і намгасных дамох.
4. Па гораду будуць адкрыты 24 пункты. У 4-х раёнах міліцыі па ным пункце ў кожным раёне, і ва ўсіх Жактах. Грамадзяне, якія жывуць Жа тах, атрымліваюць карткі ў Жактах, у камгасных і прыватных дамо пунктах раёнаў міліцыі, у пасёлках, інтэрнатах і буйных дамох на жыхарства.
5. згодна пастановы СНК, адказнасьць за правядзеньне праны на дачы новых наборных картак ускладаецца: у Жактах на старшыню Жак буйных дамох—на старшыню дамкому, у пасёлках—на старшыню дамко інтэрнатах—на заг. інтэрнату, адказнасьць за выдачу новых наборных у раёнах міліцыі ўскладаецца на прадстаўніка праўленьня МЦРК, нам. міліцыі па адм. частцы і на прадстаўніка ад гарадзкога савету. На пра ўсёй праны ўсе вышэйказаныя вызваляюцца ад праны.
6. У пунктах Жактаў і міліцыі праны пачаць з 12|II—31 г. і чыць 20|II—31 г.

ПАЙШЧЫКАМ:

7. Пры атрыманьні новых наборных картак ПАТРЭБНА прадста НАСТУПНЫЯ ДАКУМАНТЫ:
1) ламаную кнігу, 2) пазыўн, наборную і дзінячую кніжку, 3) чл білет і разьліковую кніжку з афармленьнем за апошнія 3 м-цы варплат ведку ваўкому, мясцкому для ўставаўленьня колькасьці асоб, якія знаход на утрыманьні, а таксама вылучэнцы рабочыя прадстаўляюць даведк адміністрацыі з дакладным пералічэньнем праны, якая імі выкарыстоўваецца і дакумант, разьліковую кніжку і даведку аб вылучэньні. Дзеці павінны пр віць метрыку аб нараджэньні ў 1919 годзе.

НЯПАЙШЧЫКАМ:

1. Для атрыманьня наборнай карткі—усе вышэйпералічаныя даку за выключэньнем пазыўной кніжкі і членскага білету саюзу.
2. Утрыманцы главы сям'і, якія знаходзяцца па-за Менскам, пра ляюць дакументы знаходжаньня на ўтрыманьні, даведку аб праны, якая вацца главою сям'і, з паказаньнем яго заработку.
3. Утрыманцы